# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

16 снежня 2004 года, № № 22-23 (1907-1908)


З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

## Васіль Іванавіч СТРАЖАЎ:

# “Мы зможам увайсці ў эліту еўрапейскіх універсітэтаў...”

*Госць газеты “Беларускі універсітэт” — рэктар нашага універсітэта, прафесар Васіль Іванавіч СТРАЖАЎ.*



**— Прамінула крыху больш за год з таго дня, як Вы ўзначалілі універсітэт. Не шкадуеце, што пагадзіліся на гэтае прызначэнне? Ці задавальняюць Вас вынікі Вашай працы за мінулы год?**

— Не пашкадаваў. Я выпускнік гэтага універсітэта. Тут я сфарміраваўся як асоба, атрымаў адукацыю, прафесію, якія дазволілі мне рэалізаваць сябе ў жыцці. БДУ для мяне быў, ёсць і назаўжды застанецца родным домам. Таму адказ адназначны: вядома ж, не пашкадаваў.

Іншая рэч, ці задаволены я тым, што ўдалося зрабіць за год. Безумоўна, хацелася б дасягнуць большага. Незадаволенасць вынікамі ёсць, але гэта не тая незадаволенасць, ад якой апускаюцца рукі і знікае жаданне працаваць. Яна адлюстроўвае натуральнае жаданне хутчэй ісці наперад, да вызначанай мэты. Увогуле пра задаволенасць можна будзе казаць, калі праміне дастаткова вялікі прамежак часу і ўжо будзе нешта зроблена. А падчас руху на такое пытанне і адказаць цяжка.

**— За мінулы год Вы некалькі разоў сустракаліся з Прэзідэнтам нашай краіны. Якія задачы ён ставіць сёння перад універсітэтам?**

— Прэзідэнт высока цэніць універсітэт, яго калектыў, бо роля і значэнне універсітэта ў жыцці не толькі вышэйшай школы рэспублікі, але і ўсёй краіны відавочная. Яго словы, што наш універсітэт з’яўляецца флагманам вышэйшай школы, асновай для навукі, адукацыі і культуры краіны, да многага абавязваюць. Фактычна ўсе беларускія класічныя універсітэты ўзніклі ў значнай ступені дзякуючы падтрымцы з боку БДУ. Гэта не азначае, што БДУ з’яўляецца галаўным ва ўсіх сферах. Але калі разглядаць усю сукупнасць фактараў, роля БДУ унікальная. Стаўленне Прэзідэнта да універсітэта якраз і вызначаецца гэтым фактарам. Галоўнае патрабаванне да універсітэта ў яго было і застаецца адно: каб універсітэт служыў на карысць дзяржавы, народа, асобы. У той самы час Прэзідэнт, вядома, чакае ад універсітэта і належнага разумення і падтрымкі палітыкі, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве. Канечне, ён спадзяецца, што ўвага, якую дзяржава надавала універсітэту, павінна знайсці адпаведны водгук і ў супрацоўнікаў, і ў студэнтаў. Хачу нагадаць: усё, што будавалася ва універсітэце за апошнія 8 гадоў, будавалася за дзяржаўныя, бюджэтныя грошы і дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта.

**— Вы актыўна сустракаецеся са студэнтамі, пабывалі практычна на ўсіх факультэтах і ва ўсіх інтэрнатах. На Вашу думку, як выглядае сёння так званы сярэдні студэнт БДУ? Чым ён адрозніваецца на фоне студэнтаў іншых ВНУ краіны?**

— Я пастаянна кажу: у працы трэба арыентавацца на сярэдняга студэнта. Чаму на сярэдняга? Таму што лепшых студэнтаў не трэба пераконваць, што ім трэба вучыцца. Яны і так дастаткова матываваныя. Аднак лепшыя складаюць толькі 10—15 % усяго кантынгенту. Калі з астатніх выключыць проста слабых, дык застанецца каля 70 %, якіх мы і залічаем у сярэднія студэнты.

Сярэдні студэнт БДУ — гэта студэнт, які, як правіла, не робіць нічога звыш вызначанага праграмай і вучэбнымі заняткамі. Ён жыве толькі сённяшнім днём і не надта задумваецца пра тое, што чакае яго заўтра, пасля заканчэння універсітэта.

І ў той самы час узровень нашага студэнта безумоўна вышэйшы, чым у іншых ВНУ рэспублікі. Напрыклад, у тых, хто паступае ў БДУ, самы высокі сярэдні бал у атэстаце. Таму патэнцыял тых, хто прыходзіць да нас вучыцца, найбольшы ў параўнанні з усёй рэспублікай. Пытанне толькі ў тым, як ён выкарыстоўваецца.

**— Адно з асноўных звёнаў Вашай праграмы дзеянняў — студэнцкі лідэр. За год працы Вы прыклалі нямала намаганняў, каб не толькі пазнаёміцца з імі, але і зрабіць іх удзельнікамі пераўтварэнняў, якія праводзяцца. Ці ўдалося гэта? Ці задавальняе Вас “якасць” студэнцкіх лідэраў?**

— Сучасная вышэйшая школа не можа развівацца без рэальнага дзейснага ўдзелу студэнцтва ў арганізацыі яе працы. У сувязі з гэтым дарэчы будзе прыгадаць, што гістарычна універсітэты ўзнікалі двуякім чынам. У Балоны, напрыклад, выкладчыкі прапанавалі свае паслугі студэнтам. А ў Парыжы, наадварот, студэнты аб'ядналіся і нанялі сабе выкладчыкаў. Але з цягам часу паўсюль, у тым ліку і на Захадзе, паступова студэнты перасталі быць актыўнымі саўдзельнікамі арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Сённяшняя вышэйшая адукацыя, і я падзяляю гэтае меркаванне, патрабуе актыўнага ўключэння ў арганізацыю адукацыі тых, хто гэтую адукацыю атрымлівае. Падчас сустрэч са студэнтамі БДУ мяне перадусім цікавіла, наколькі яны і іх лідэры гатовыя да гэтай дзейнасці, усведамляюць яе неабходнасць. Само па сабе стварэнне студэнцкага Савета па якасці адукацыі, яшчэ да майго прызначэння, дарэчы, кажа пра тое, што студэнцтва зацікаўлена быць удзельнікам гэтага працэсу. Аднак падчас сустрэч я пераканаўся, што гэтая зацікаўленасць пакуль усё-такі носіць пераважна дэкларатыўны характар. Большасць студэнтаў не бачыць свайго месца ў арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу. Давядзецца шукаць яго разам.

Якасць студэнцкіх лідэраў за апошнія гады, безумоўна, вырасла. Яны сталі больш самастойнымі, незалежнымі, раскаванымі. У той жа час у адрозненне, напрыклад, ад часоў маёй маладосці, у іх слабейшыя навыкі арганізатарскай работы і яны менш здольныя на самастойныя арганізацыйныя дзеянні. Магчыма, гэта наступствы развалу той сістэмы, якая рыхтавала лідэраў, актывістаў у савецкай школе. У той

(Заканчэнне на 2-й стар.)

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


*Пра тое, як будзе рэфармавацца ў бліжэйшыя гады шматступенчатая сістэма адукацыі ў БДУ, расказвае прарэктар па вучэбнай рабоце **Віктар Васільевіч САМАХВАЛ**.*

Старонка 3

*Пра супрацоўніцтва БДУ з іншымі ВНУ краіны разважае прарэктар па міжнародных сувязях **Уладзімір Аркадзьевіч АСТАПЕНКА**.*

Старонка 3

*Якія змены павінны адбыцца ў выдавецкай дзейнасці БДУ? Якім чынам будзе ўдасканальвацца праца Фундаментальнай бібліятэкі універсітэта? На гэтыя і іншыя пытанні адказвае госць газеты “Беларускі універсітэт” — прарэктар па вучэбнай рабоце **Уладзімір Леанідавіч КЛЮНЯ**.*

Старонка 4

*Як адшукаць свайго абітурыента? На пытанні “Беларускага універсітэта” адказвае дэкан факультэта дауніверсітэцкай адукацыі для беларускіх і замежных грамадзян **Вячаслаў Міхайлавіч МАЛАФЕЕЎ**.*

Старонка 6

*Пра ўкараненне ў адукацыйны працэс інфармацыйных тэхналогій расказвае прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі **Павел Аляксеевіч МАНДРЫК**.*

Старонка 7

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Васіль Іванавіч СТРАЖАЎ: "Мы зможам увайсці ў эліту еўрапейскіх універсітэтаў..."

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

жа час я гляджу ў будучыню з аптымізмам. Калі універсітэт — студэнцкі дом, значыць, яны павінны быць у ім гаспадарамі. А быць гаспадарамі — значыць, адказваць, самім арганізоўваць сваё жыццё.

**— Вы добра ведаеце вышэйшую школу бліжняга замежжа. Наколькі захавалася яе адзінства за гады, якія прайшлі пасля распаду СССР? Як беларуская вышэйшая школа, і ў прыватнасці наш універсітэт, выглядаюць на фоне іншых постсавецкіх краін?**

— На жаль, аб'ектыўных вымяральнікаў для параўнання якасці працы ВНУ пакуль няма. Таму мае ацэнкі грунтуюцца толькі на суб'ектыўным досведзе.

Я думаю, сёння сярэдні ўзровень нашай вышэйшай школы вышэй за ўсіх не толькі ў СНД, але і на ўсёй постсавецкай прасторы. Падкрэсліваю — сярэдні ўзровень. Таму што ў той самай Расіі, безумоўна, ёсць ВНУ-лідэры, да ўзроўню якіх мы пакуль не дацягваем. Чаму ў нас вышэй? Таму што беларуская дзяржава, адзіная з постсавецкіх, аказвала і аказвае вышэйшай школе сапраўды сур'ёзную дапамогу. Па-першае, толькі ў Беларусі дзяржава аплочвала ВНУ камунальныя паслугі, капітальны і бягучы рамонт будынкаў і нават будавала новыя. Па-другое, узровень нашай заработнай платы "ніжэй калена" ніколі не апускаўся. А так было ва ўсіх постсавецкіх краінах. Па-трэцяе, сярэдні ўзровень беларускай вышэйшай школы і ў гады БССР быў вышэйшы за агульнасаюзны. У нас не было зусім слабых ВНУ. Мы гэты больш высокі ўзровень агульнымі намаганнямі захавалі.

Калі казаць пра БДУ, няма сумненняў, што ён уваходзіць у эліту постсавецкай вышэйшай школы. А вось якое канкрэтна месца ён там займае, меркаваць не бяруся.

Ну, а як выглядае вышэйшая школа постсавецкай прасторы? Яна павольна разбураецца. Унутры некалі адзінага будынка ёсць, вобразна кажучы, пакоі і пасля еўрарамонту, але ў цэлым будынак занепадае. І ён будзе працягваць руйнавацца, бо вышэйшая школа без грошай існаваць не можа. А грошай большасць нашых суседзяў у сваю вышэйшую школу па-ранейшаму ўкладае недастаткова.

**— Падчас замежных камандзіровак Вам неаднаразова даводзілася наведваць універсітэты краін далёкага замежжа, вывучаць іх працу. Ці вытрымлівае наш універсітэт параўнанне з вядучымі універсітэтамі Еўропы, ЗША? У чым падабенства і асноўныя адрозненні? Чым падобныя і чым адрозніваюцца нашыя студэнты, выкладчыкі, навуковыя работнікі і кіраўнікі ад тамтэйшых?**

— Студэнты, у прынцыпе, адрозніваюцца толькі большай ці меншай старааннасцю.

Выкладчыкі... Адрозненні паміж выкладчыкамі ёсць. Але яны не ва ўзроўні кваліфікацыі, а хутчэй у менталітэце. Славяне не могуць не адрозніваццa, напрыклад, ад англасаксаў. Гэта не значыць, што мы лепшыя, але і не азначае, што мы горшыя. Мы іншыя. Калі студэнты ў прынцыпе падобныя, то выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі ўжо іншыя, і гэта звязана, яшчэ раз падкрэсліваю, не са сферай прафесійнай дзейнасці. А вось заходнія кіраўнікі адрозніваюцца ад нашых больш высокім узроўнем прафесійнай кампетэнтнасці і, як ні дзіўна, большай забюракратызаванасцю.

> *Кожная ВНУ, якая прэтэндуе на тое, каб быць у эліце, павінна мець сістэму адукацыі, адпаведную сусветным стандартам.*

Ці вытрымлівае наш універсітэт параўнанне з вядучымі універсітэтамі свету? У ЗША, напрыклад, ёсць розныя ВНУ. Думаю, нам няма сэнсу параўноўваць сябе з элітарнымі амерыканскімі ВНУ (іх і ў Амерыцы ўсяго з дзесятак набярэцца). А вось параўнанне з добрай амерыканскай ВНУ мы вытрымаем.

У той самы час варта прызнаць, што сярэдні студэнт добрай заходняй ВНУ вышэйшы за сярэдняга студэнта БДУ. Найлепшыя студэнты такія ж, а вось сярэдні студэнт — вышэй. У заходніх ВНУ, вобразна кажучы, лепш вучаць рамяству, практычна кожнаму выпускніку гарантуюць пэўны ўзровень падрыхтоўкі. У нас сам факт наяўнасці дыплома не заўжды азначае, што чалавек стаў прафесіяналам у гэтай галіне.

> *Сучасная вышэйшая школа не можа развівацца без рэальнага дзейснага ўдзелу студэнцтва ў арганізацыі яе працы.*

**— Выступаючы на чэрвеньскім 2004 г. пасяджэнні Вучонага савета БДУ, Вы сказалі, што універсітэт здатны да свайго 90-гадовага юбілею "не толькі ўвайсці ў эліту еўрапейскіх універсітэтаў, але і на парадак павысіць сваю ролю ў вырашэнні найважнейшых сацыяльна-эканамічных праблем, якія стаяць перад беларускім грамадствам". Ці не можаце Вы сцісла сфармуляваць асноўныя задачы, вырашэнне якіх дазволіць дамагчыся гэтай мэты? Якія змены павінны адбыцца для гэтага ў навучальна-выхаваўчым працэсе, навукова-інавацыйнай сферы, матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні? Наколькі бліжэй мы сталі да дасягнення гэтай мэты за мінулы год?**

— Бліжэй, на жаль, практычна не сталі. Гэта не значыць, што год прамінуў упустую. Проста высветлілася, што для вырашальнага рыўка павінен быць зроблены значна большы аб'ём падрыхтоўчай працы.

Радуе, што на ўзроўні рэктарата, кіраўніцтва факультэтаў ужо ёсць разуменне зробленага выбару. Пра гэта, у прыватнасці, сведчаць слуханні факультэтаў на пашыраных пасяджэннях рэктарата. Шчыра кажучы, іншага я не чакаў. Універсітэцкія кіраўнікі, дэканы, — сапраўдныя прафесіяналы, здольныя і аналізаваць бягучую сітуацыю, і прымаць адэкватныя рашэнні. А калі прафесіяналы перакананыя ў патрэбнасці, карысці тых ці іншых дзеянняў, значыць, варта чакаць і вынікаў.

Сёння яны перакананыя, што сістэму навучання ва універсітэце трэба мяняць. У гэтым перакананыя ўжо і многія загадчыкі кафедраў. Пытанне толькі ў тым, каб ясна сфармуляваць мэты, задачы і шляхі іх дасягнення. Таму што калі няма ні таго, ні другога, то, натуральна, як бы нам ні хацелася нешта змяніць, нічога не зменіцца.

У прыватнасці, высветлілася (для мяне гэта таксама было сюрпрызам), што на сёння не існуе прыдатнай для нас электроннай сістэмы кіравання адукацыйным працэсам у маштабах універсітэта. Для вырашэння гэтай задачы факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі аб'ядноўвае намаганні з адной з вядомых беларускіх камп'ютарных фірмаў. Яе спецыялісты бяруцца ў супрацоўніцтве з БДУ за паўгода распрацаваць неабходную нам сістэму кіравання.

Іншы прыклад. Высветлілася, што калі кожнаму факультэту купляць неабходную камп'ютарную тэхніку, не хопіць ні грошай, ні памяшканняў для яе ўстаноўкі. Таму думаем пайсці шляхам стварэння медыятэк. Гэта чытальні, дзе на сталах усталяваныя камп'ютары, падлучаныя да ўнутранай сеткі БДУ і Інтэрнэта. Ужо і відаць, дзе яны могуць быць. Генеральнае ж вырашэнне ўсіх інфармацыйных праблем — рэканструкцыя актавай залы ў галоўным корпусе, ператварэнне яе часткова ў медыятэку, а часткова — у агульную вялікую чытальню. Гэта, дарэчы, наглядны прыклад таго, што вышэйшую школу нельга рэфармаваць, не ўкладаючы грошай. Іншая рэч, што сыходзіць трэба з таго, што ёсць. І эфектыўнасць укладання грошай залежыць ад эфектыўнасці прымаемых рашэнняў па выкарыстанні гэтых грошай. Мы, напрыклад, пераабсталюем 206-ы кабінет у галоўным корпусе (былая зала пасяджэнняў Вучонага савета) для цэнтралізаванага тэсціравання студэнтаў усіх факультэтаў па вучэбных прадметах. Гэта прыклад таго, як канцэнтрацыя намаганняў і сродкаў дапаможа вырашэнню важнага для ўсяго універсітэта пытання.

Я перакананы, што мы зможам увайсці ў эліту еўрапейскіх універсітэтаў пры ўмове, што зробім усё, што задумалі. Кожная ВНУ, якая прэтэндуе на тое, каб быць у эліце, павінна мець сістэму адукацыі, адпаведную сусветным стандартам. У нас сёння найлепшым сусветным стандартам сістэма адукацыі пакуль не адпавядае. А калі арганізацыя навучання ва універсітэце ім будзе адпавядаць, то і выкладчыцкі састаў падцягнецца. Бо універсітэцкая моладзь не толькі да грошай цягнецца, не менш яна цягнецца да цікавай працы. Безумоўна, агульны ўзровень аплаты павінен быць высокім. Аднак прынцыповае адрозненне выкладчыцкай і навуковай працы ў тым, што гэта і эфектыўны сродак самавыяўлення.

Як на парадак павысіць ролю універсітэта ў вырашэнні найважнейшых сацыяльна-эканамічных праблем краіны? Найважнейшы ўнёсак універсітэта — гэта падрыхтоўка спецыялістаў высокага ўзроўню. Чым вышэй узровень падрыхтаванасці спецыялістаў, тым большы ўнёсак яны могуць зрабіць у развіццё нашага грамадства. Таму што, паверце мне, чым болей у нас падрыхтаваных людзей на кожным месцы, тым лепш для грамадства і дзяржавы. Вось такая існуе прамая сувязь. Чым лепшыя ў нас спецыялісты, тым вышэй узровень рашэнняў, якія прымаюцца, тым вышэй узровень рэалізацыі гэтых рашэнняў. Вось гэта і ёсць унёсак у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, прамы і непасрэдны.

**— Што б Вы хацелі пажадаць калектыву універсітэта ў надыходзячым 2005 годзе?**

— Па-першае, я думаю, кожны чалавек павінен ганарыцца, што ён працуе ва універсітэце. Тое, што мы ва універсітэце, павінна напаўняць гонарам. І наш універсітэт здольны да значна большых здзяйсненняў, у яго ёсць вялікі патэнцыял. Пытанне заключаецца ў тым, як гэты патэнцыял рэалізаваць. Таму маё самае асноўнае пажаданне — каб гэты патэнцыял у 2005 годзе атрымаў большую рэалізацыю ў параўнанні з мінулым часам. У сваю чаргу, гэта азначае большую самарэалізацыю кожнага з нас, і ў канцавым выніку будзе выяўляцца і ў большых матэрыяльных дабротах. Ужо сёння універсітэт выйшаў на першае месца па краіне па ўзроўні сярэдняга заробку ПВС. Думаю, мы гэтага лідэрства не страцім. Жадаю ўсім членам універсітэцкага калектыву дабра, шчасця, ладу ў сям'і, выканання жаданняў, прафесійных поспехаў. Кажу шчыра: мне ва універсітэце працаваць цікава. Няхай і вам усім будзе добра ў нашым агульным доме.

> *Чым вышэй узровень падрыхтаванасці спецыялістаў, тым большы ўнёсак яны могуць зрабіць у развіццё нашага грамадства.*

*Таццяна КАЗАК*

ВІНШУЕМ!

## Урадавая ўзнагарода — ліцэю БДУ

Ліцэй БДУ стаў першай навучальнай установай, узнагароджанай у 2004 г. прэміяй урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці. Навучальнай установе дасталася прэмія "За ўкараненне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю і забеспячэнне на гэтай аснове выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі".

За 15 гадоў існавання ліцэй выпусціў больш за 3000 навучэнцаў, 20 з якіх ужо абаранілі кандыдацкія дысертацыі ў Беларусі, а 10 — на міжнародным узроўні. Больш за 100 навучэнцаў сталі пераможцамі міжнародных алімпіяд. Ліцэй БДУ — адна з тых устаноў адукацыі, чые выпускнікі практычна на 100 % паступаюць у ВНУ Беларусі, Расіі, іншыя прэстыжныя замежныя універсітэты.

Сёння ў ліцэі існуюць 6 профіляў навучання: матэматычны, фізічны, хімічны, хіміка-біялагічны, філалагічны, гісторыка-грамадазнаўчы. Няпрофільныя прадметы навучэнцам выкладаюць так званым "модульна-блочным" спосабам: некалькі прадметаў аб'ядноўваюцца ў адзін урок. Менавіта профільнае навучанне ў старэйшых класах спрыяе павышэнню якасці падрыхтоўкі выпускнікоў.

*Наталля КАСЬЯНЕНКА*

КОНКУРСЫ

## Конкурс грантаў

Абвяшчаецца конкурс грантаў на правядзенне навуковых даследаванняў студэнтамі, магістрантамі і аспірантамі БДУ.

**Дакументы прадастаўляюцца да 17.01.2005 г. у аддзел НДРС УПКВК ГУН (тэл. 209-54-27, п. 418, вул. Бабруйская, 9).**

Інфармацыю пра конкурс (Палажэнне пра конкурс і правілы афармлення) можна атрымаць у адказных за НДРС на факультэтах, ці пазнаёміцца з ёй на серверы БДУ (Агульныя папкі — Усе агульныя папкі — Навукова-даследчая работа студэнтаў — Конкурс грантаў), ці на сайце аддзела **(http://nirs.bsu/ )**.

*Аддзел НДРС*

## Лідэр года

Вынікі агляду-конкурсу "Лідэр года" Маскоўскага раёна сталіцы былі падведзеныя 8 снежня на базе БДПУ імя Максіма Танка. Арганізатарам мерапрыемства выступіў аддзел па справах моладзі адміністрацыі Маскоўскага раёна. Падчас конкурсу разглядалася больш за 20 заявак, тры з якіх належалі нашаму універсітэту: студэнцкі цэнтр занятасці камітэта БРСМ БДУ, студэнцкая служба бяспекі БДУ, інтэрнат № 10. Пераможцам у намінацыі "Найлепшае маладзёжнае аб'яднанне" стаў студэнцкі цэнтр занятасці камітэта БРСМ БДУ. Зычым цэнтру занятасці паспяховай працы і ўдачы на гарадскім конкурсе, вынікі якога будуць падведзеныя 27 снежня.

*Аляксандр ЛЯНКЕВІЧ*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Галоўнае — павысіць якасць адукацыі

*На пытанні "Беларускага універсітэта" адказвае прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ, доктар хімічных навук Віктар Васільевіч САМАХВАЛ.*

**— У 2001 годзе БДУ першым у краіне пачаў шматступенчатую падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па схеме бакалаўр—спецыяліст—магістр. Якім чынам гэтая сістэма будзе рэфармавацца ў бліжэйшыя гады? Які лёс чакае бакалаўраў, якіх БДУ павінен выпусціць ужо ў наступным годзе?**

— Трэба адзначыць, што права прысуджаць акадэмічныя ступені бакалаўра і магістра беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы атрымалі яшчэ ў 1991 г. з прыняццем "Закона аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь". Але закон не акрэсліў дакладна патрабаванні да адукацыйных праграм падрыхтоўкі бакалаўра і магістра, і толькі ў 2001 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Палажэнне аб вышэйшай адукацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, а ў 2002 г. — Палажэнне аб ступенях вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. У адпаведнасці з гэтымі дакументамі БДУ і пачаў рыхтаваць спецыялістаў па схеме бакалаўр—спецыяліст—магістр, што фактычна азначае наяўнасць трох ступеняў вышэйшай адукацыі.

Зацверджаная ў 2004 годзе Саветам Міністраў Канцэпцыя ўкаранення двухступенчатай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у Рэспубліцы Беларусь, прыняты парламентам у першым чытанні праект Закона аб вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь прадугледжваюць не тры, а толькі дзве ступені вышэйшай адукацыі, прычым бакалаўр фактычна прыроўніваецца да традыцыйнага спецыяліста з пяцігадовым тэрмінам навучання. Хутчэй за ўсё ў дыпломе выпускніка першай ступені будзе запісана, што ён атрымаў кваліфікацыю па сваёй спецыяльнасці і адначасова яму прысуджана акадэмічная ступень бакалаўра. Зараз абмяркоўваецца і іншы падыход да адукацыйных праграм бакалаўрскай падрыхтоўкі.

Як у новых абставінах складзецца лёс тых студэнтаў БДУ, якія навучаюцца па бакалаўрскіх праграмах? Папершае, ім не трэба турбавацца. Любое кіраўнічае рашэнне, якое прымаецца ва універсітэце, абавязкова ўлічвае інтарэсы студэнтаў. Таму ў адпаведнасці з рашэннем рэктара мы будзем атэстоўваць усіх студэнтаў дзённай формы навучання на атрыманне ступені бакалаўра, але завяршыць навучанне пасля азначанай атэстацыі будуць толькі тыя студэнты, якія гэтага пажадаюць. Я ведаю, што сярод будучых бакалаўраў такія студэнты ёсць. Нехта ўжо знайшоў сабе добрую працу, іншыя не бачаць сэнсу ў працягу адукацыі.



Канешне, бакалаўр будзе мець на першых этапах сваёй практычнай дзейнасці нейкія абмежаванні на заняцце пасад. Але гэта не значыць, што такія абмежаванні — на ўсе жыццё. Па меры росту кваліфікацыі ніякіх перашкодаў у службовай кар'еры бакалаўра не павінна быць.

Сёння абмяркоўваецца і іншы пункт гледжання на адукацыйныя праграмы бакалаўрскай падрыхтоўкі, згодна з якім бакалаўр валодае толькі фундаментальнымі ведамі, але не мае спецыяльнай падрыхтоўкі. Напэўна, такі бакалаўр не будзе мець права ўвогуле працаўладкоўвацца па спецыяльнасці. З такім падыходам цяжка пагадзіцца хаця б таму, што гэта пярэчыць сістэме, якая ўкараняецца ў краінах еўрапейскага рэгіёну.

Мы мяркуем, што ўжо пасля 4-га курса лепшыя студэнты па рэйтынгу паспяховасці павінны залічвацца ў магістратуру з двухгадовым тэрмінам навучання. Таму было б правільным значна павялічыць план прыёму ў двухгадовую магістратуру. Менавіта пра гэта мы напісалі хадайніцтва ў Міністэрства адукацыі. Калі ў нас было запланавана ўсяго 30 месцаў у двухгадовую магістратуру, то зараз мы хацелі б мець не менш за 300 такіх месцаў. Яшчэ частка студэнтаў набору 2001 г., канешне, павінна мець магчымасць паступіць у аднагадо-

*(Працяг на 4-й стар.)*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Універсітэты: каардынацыя намаганняў

*Пра супрацоўніцтва паміж універсітэтамі разважае прарэктар па міжнародных сувязях БДУ, загадчык кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Уладзімір Аркадзьевіч АСТАПЕНКА.*

**— Наколькі важна для развіцця БДУ і ўсёй вышэйшай школы Беларусі наладжванне цеснага ўзаемадзеяння нашага універсітэта з іншымі класічнымі і педагагічнымі універсітэтамі рэспублікі?**

— Беларускі дзяржаўны універсітэт як вядучая ВНУ рэспублікі заўсёды прыцягваў увагу іншых вышэйшых навучальных устаноў. Мы разумеем, што кожная рэгіянальная ВНУ мае сваю спецыфіку і займае сваю нішу на рынку адукацыйных паслуг. Таму натуральна, што ў рамках агульнай адукацыйнай сістэмы вядучыя і рэгіянальныя ВНУ ўзаемадзейнічаюць па розных вучэбных, навуковых, адміністрацыйных пытаннях. Аднак раней гэта ўзаемадзеянне было спантанным і не насіла структурны характар. І таму ініцыятыва, якая была выпучана рэктарам БДУ Васілём Іванавічам Стражавым, выйсці на іншы ўзровень узаемадзеяння паміж класічнымі універсітэтамі краіны была пазітыўна ўспрынята ўсімі зацікаўленымі ВНУ. Такім чынам з'явілася ідэя аб распрацоўцы шматбаковага пагаднення паміж класічнымі і педагагічнымі універсітэтамі. Пасля актыўнага абмену думкамі на двухбаковай аснове быў распрацаваны праект пагаднення, якое і падпісалі 9 рэктараў у святочнай абстаноўцы на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БДУ у чэрвені 2004 года. Паміж сабой дамовіліся класічныя універсітэты з Мінска, Брэста, Гродна, Магілёва, Гомеля, Полацка, Віцебска, а таксама педагагічныя універсітэты з Мінска і Мазыра. Логіка далучэння педагагічных універсітэтаў зразумелая, таму што ў аснове сумесных дзеянняў гэтых 9 ВНУ ляжыць распрацоўка нарматыўна-праваой базы і метадычных матэрыялаў, звязаных з паляпшэннем якасці адукацыі, з удасканаленнем адукацыйных тэхналогій і з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных сродкаў. Дагавор, падпісаны ў чэрвені, рамачны і прадугледжвае супрацоўніцтва па розных кірунках дзейнасці універсітэтаў: вучоба, навука, міжнародныя праграмы, сумесныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, абмен выкладчыкамі і студэнтамі і г.д.



**— Якім чынам будзе рэалізоўвацца дагавор?**

— Галоўны элемент гэтага дагавора — распрацоўка рабочых праграм на двухбаковым узроўні, паміж БДУ і кожным з партнёраў гэтага пагаднення. На працягу апошніх месяцаў мы актыўна займаемся распрацоўкай прапаноў да гэтых рабочых праграм, якія будуць улічваць спецыфіку нашых рэгіянальных партнёраў. Магістральным кірункам у рамках гэтых рабочых праграм будуць нашы сумесныя дзеянні па падрыхтоўцы кадраў для рэгіянальных ВНУ. Гэта работа можа набываць самыя разнастайныя формы. Напрыклад, выпускнік рэгіянальнай вышэйшай навучальнай установы будзе на мэтавай аснове накіроўвацца ў аспірантуру БДУ і пасля паспяховай абароны тут кандыдацкай дысертацыі вяртацца выкладаць у родны універсітэт. Мы будзем актыўна прапаноўваць нашым калегам навучанне ў магістратуры БДУ. Хутчэй за ўсё будзе арганізавана ўключанае навучанне, калі старшакурснік рэгіянальнай ВНУ будзе давучвацца па асобных спецыяльнасцях у БДУ. Ёсць магчымасць стымуляваць выкладчыцкі абмен. Нашы выкладчыкі могуць быць запатрабаваны рэгіянальнымі ВНУ для чытання спецыяльных курсаў лекцый, для удзелу ў дзяржаўных экзаменацыйных камісіях і г.д. Мы пастараемся стымуляваць студэнцкія абмены. Навуковыя супрацоўнікі арыентаваны на тое, каб сустракацца адзін з адным і супастаўляць вынікі сваіх навуковых даследаванняў. Чакаецца актыўнае развіццё навуковага супрацоўніцтва праз арганізацыю навуковых канферэнцый, праз актыўны абмен інфармацыяй аб навуковых даследаваннях. Вядома, што трэба ставіць задачу, каб стварыць інтэграваную інфармацыйную сетку, з дапамогай якой мы маглі б хутка і эфектыўна наладзіць абмен інфармацыяй аб галоўных падзеях з жыцця універсітэтаў-партнёраў.

**— Ці паспрыяе аб'яднанне інтарэсаў класічных універсітэтаў нашай краіны міжнароднаму супрацоўніцтву?**

— Натуральным працягам тэмы супрацоўніцтва паміж ВНУ краіны з'яўляецца і каардынацыя іх намаганняў на міжнароднай арэне. Апошнім часам на першае месца выходзяць такія шматбаковыя праграмы, якія загадзя прадугледжваюць удзел не адной, а некалькіх ВНУ з адной краіны. Прыкладам паспяховага выканання такіх праграм з'яўляецца TEMPUS-праект, у якім акрамя БДУ ўдзельнічалі універсітэты Гродна і Гомеля, а таксама французскія партнёры.

Я ўпэўнены ў тым, што праграма ўзаемадзеяння БДУ з класічнымі і педагагічнымі універсітэтамі рэспублікі будзе спрыяць развіццю нашых рэгіянальных універсітэтаў, пашыраць магчымасці для сумесных дзеянняў, узмацняць аўтарытэт паміж ВНУ.

*Ганна ЛАГУН*

*Фотаздымак Аляксандра СНАПКА*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Праграмісты БДУ паедуць на фінал

*Каманда факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ будзе ўдзельнічаць у фінале каманднага чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў. На гэтыя спаборніцтвы наша каманда ў складзе Аляксея Данчанкі, Івана Заўгароднева і Аляксея Кіркоўскага паедзе ўвесну 2005 года.*

Трэба адзначыць, што чэмпіянат свету адбываецца ў рамках міжнароднай асацыяцыі ACM (Association for Computer Machinery). Гэта аўтарытэтная арганізацыя ў свеце камп'ютараў, якая аб'ядноўвае больш за 80 000 навукоўцаў, інжынераў, праграмістаў, студэнтаў — спецыялістаў, якія займаюцца праблемамі сучаснага камп'ютарнага свету. Поле дзейнасці ACM вельмі шырокае: арганізацыя ладзіць канферэнцыі, выдае часопісы і падручнікі, прысуджае штогадовыя прэміі за дасягненні ў галіне тэарэтычнай інфарматыкі і камп'ютарных тэхналогій.

Адной з галоўных падзей у дзейнасці ACM з'яўляецца фінал каманднага чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў. Каб апынуцца ў фінале, камандам трэба было прайсці паўфінальны тур, які адбываўся ў Санкт-Пецярбургу, а таксама ў рэжыме on-line у Барнауле, Ерэване і Ташкенце. У паўфінале ўдзельнічалі 173 каманды з ВНУ Беларусі, Грузіі, Арменіі, Расіі, Латвіі, Літвы, Эстоніі ды іншых краін былога СССР (акрамя Украіны і Малдовы). З іх у фінал прайшла 21 каманда, сярод якіх і каманда БДУ.

У фінальных спаборніцтвах наша каманда будзе ўдзельнічаць у шосты раз, чаго не ўдавалася пакуль ніводнай камандзе з універсітэтаў Беларусі і краін Балтыі. Па рэйтынгу ВНУ, якія вызначаюць на паўфінальных спаборніцтвах, БДУ ўваходзіць у тройку найлепшых універсітэтаў Паўночна-Усходняга еўрапейскага рэгіёну. Гэта яшчэ раз пацвярджае высокі ўзровень падрыхтоўкі праграмістаў БДУ.

Адзначым, што пераможцы спаборніцтва атрымаюць знакамітую ўзнагароду ACM — Annual Meeting Turning Award, якую называюць нобелеўскай прэміяй у галіне камп'ютараў. Спадзяемся, што атрымае яе менавіта каманда нашага універсітэта.

*Юлія ПАПОВА*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Галоўнае — павысіць якасць

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.)

вую магістратуру. Таму мы заказваем прыкладна 100 месцаў для выпускнікоў гэтага навучальнага года.

Галоўны дакумент, якога мы цяпер чакаем, гэта Закон аб вышэйшай адукацыі. З яго прыняццем будуць расстаўлены ўсе кропкі і мы будзем мець магчымасць скарэктаваць сваю мэтавую праграму развіцця шматступенчатай адукацыі, якая распрацавана на 2004—2010 гг. Калі ў законе будзе ўстаноўлена, што бакалаўр — гэта цяперашні 5-гадовы выпускнік-спецыяліст, то мы можам хоць з гэтага года цалкам перайсці на двухступенчатую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў. Ужо цяпер у нас пад кожную спецыяльнасць распрацаваны неабходныя вучэбныя планы — 4-гадовыя, 5-гадовыя, 6-гадовыя.

**— Раскажыце, калі ласка, пра новыя формы дыпломаў, якія распрацавала Міністэрства адукацыі разам з БДУ.**

— Цяпер вельмі многа розных дыпломаў. Нават ёсць дыплом аб спецыяльнай вышэйшай адукацыі — калі можаш навучацца 6 гадоў, але не атрымаць ступень магістра, калі не абараніў альбо не абараняў дысертацыю. Ёсць дыплом магістра, у якім фіксуецца кваліфікацыя і акадэмічная ступень магістра. Ёсць традыцыйны дыплом спецыяліста. І ёсць дыпломы бакалаўраў двух тыпаў. Адзін — у якім не ўтрымліваецца звестак аб прысуджанай кваліфікацыі, а проста пацвярджаецца, што рашэннем ДзЭК прысуджана акадэмічная ступень бакалаўра. А ёсць дыпломы, якія падрыхтаваны ў адпаведнасці з Палажэннем аб вышэйшай адукацыі ў БДУ. Гэты дыплом пацвярджае наяўнасць вышэйшай адукацыі першай ступені з прысуджэннем кваліфікацыі і акадэмічнай ступені бакалаўра.

**— Адной са стратэгічных мэтаў БДУ з'яўляецца сучасная арганізацыя магістратуры. Якім чынам будзе ўдасканальвацца гэтая праца? Ці зможа магістратура БДУ бліжэйшым часам стаць цэнтрам магістэрскай падрыхтоўкі для выпускнікоў іншых ВНУ Беларусі па новых спецыяльнасцях?**

— Калі без змен у другім чытанні будзе прыняты Закон аб вышэйшай адукацыі, БДУ можа фактычна ператварыцца ў кузню бакалаўраў. Таму што асноўная маса студэнтаў у нас навучаецца 5 гадоў, а гэта ў адпаведнасці з дадзеным законам будзе першая ступень вышэйшай адукацыі. Але я мяркую, што БДУ як вядучая вышэйшая навучальная ўстанова нашай краіны павінна ў перспектыве выпускаць да 50-60 % магістраў ад агульнай колькасці выпуску.

Мы спадзяемся, што з цягам часу паступаць у аспірантуру змогуць толькі выпускнікі магістратуры. Сёння ж у нас магістрантаў значна менш, чым аспірантаў. А павінна быць наадварот. Задача нашага ўніверсітэта — рыхтаваць магістраў масава, а не па 100 чалавек у год, як зараз. Вось на гэта і накіравана наша праграма: каб магістратура стала больш масавай. І ў першую чаргу двухгадовая. Што гэта дае студэнтам? А тое, што яны на пятым курсе не будуць губляць цэлы семестр на падрыхтоўку і абарону дыпломнай працы, а адразу пачнуць працаваць над якаснай магістэрскай дысертацыяй.

Аднагадовая магістратура ў цэлым не можа лічыцца эфектыўнай. Зараз над дыпломнай працай многія студэнты працуюць амаль з першага курса, гадамі набіраюць матэрыял, курсавыя працы ў яе ўключаюць, вытворчую практыку праходзяць. А тут фактычна за семестр неабходна набраць матэрыял для магістэрскай дысертацыі! У выніку студэнты проста будуць вымушаны неяк па-іншаму перапісваць сваю дыпломную працу ў якасці магістэрскай.

Сёння, калі яшчэ не вызначаная дакладна па кожнай спецыяльнасці тэрміны навучання ў магістратуры — адзін ці два гады, мы яшчэ не маем магчымасці дакладна вызначыцца з адукацыйным стандартам магістэрскай падрыхтоўкі. Для аднагадовай магістратуры мы прынялі часовае рашэнне, што гэты год трэба выкарыстаць так, каб студэнты змаглі здаць экзамены кандыдацкага мінімуму, што многія і робяць. Яны здаюць філасофію, замежную мову, здаюць залікі па педагогіцы, псіхалогіі, па інфарматыцы. Гэта вызваляе час для больш эфектыўнай працы над дысертацыяй у аспірантуры. Але, на мой пункт гледжання, няправільна рабіць з магістратуры нейкую падрыхтоўку да аспірантуры. Магістратура павінна даваць пераважна спецыяльную падрыхтоўку, каб мы выпускалі праз яе спецыяліста сапраўды высокага класа.

Дарэчы, пералік спецыяльнасцей магістратуры не абавязкова павінен супадаць з пералікам спецыяльнасцей бакалаўрыяту. Сусветная практыка сведчыць, што ў магістратуры могуць быць інтэграваныя спецыяльнасці, якія дазваляюць асвоіць нейкія сумежныя галіны навукі. Ужо ёсць прапановы ад гістарычнага факультэта, факультэта філасофіі і сацыяльных навук аб увядзенні інтэграваных спецыяльнасцей праз магістратуру.

Магістратура стварае таксама магчымасць выпускнікам вышэйшых навучальных устаноў адначасова атрымаць другую вышэйшую адукацыю. Але пры гэтым тэрмін навучання павінен устанаўлівацца індывідуальна і можа дасягаць 4-х гадоў. Навучанне ў такой магістратуры павінна быць толькі платным, як і другая вышэйшая адукацыя.

Увогуле я лічу, што магістратура ў значнай меры павінна быць платнай. Трэба захаваць бясплатнай першую ступень вышэйшай адукацыі, якая з'яўляецца масавай. А калі хочаш атрымаць элітную вышэйшую адукацыю, то ўжо гэта — за кошт установы, якая ў гэтым зацікаўлена, альбо за кошт сваіх сродкаў.

**— Распавядзіце, калі ласка, пра рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў па прадмеце і па спецыяльнасці.**

— Рэйтынгавая сістэма ў нас ужо працуе на некаторых факультэтах. Прычым рэйтынг укаранёны не толькі па навучальным прадмеце, але і па спецыяльнасці.

Дарэчы, калі мы пераходзілі на 10-бальную сістэму, то былі такія меркаванні: "Навошта гэта патрэбна? Студэнты ніяк не будуць разумець гэтую сістэму". Сусветны вопыт сведчыць, што ва ўсіх краінах разам з лічбавай працягвае існаваць якасная сістэма ацэнкі ведаў, якая раней была ў нас: "выдатныя веды", "добрыя", "здавальняючыя" і "нездавальняючыя". Ну, а ўжо ў межах гэтых градацый існуюць набраныя балы. Мае пэўны сэнс і наяўнасць трох адзнак (1, 2, 3), якія адносяцца да нездавальняючых. Калі ў мяне 3 балы — то мне яшчэ трэба крыху папрацаваць над прадметам, і я яго здам. Калі мне толькі 1 бал налічылі — трэба шмат-шмат працаваць, каб здаць прадмет. Без такой сістэмы больш складана вызначыць рэйтынг студэнта. У яе рамках за кожную кантрольную, эсэ і г.д. налічваецца пэўная колькасць балаў. Па гэтай суме разам з адзнакай па экзамене і выводзіцца агульная адзнака па прадмеце.

Такім чынам, у перспектыве можна будзе вывесці агульны рэйтынг на навучальным курсе. Ён быў бы вельмі прыдатны для адбору студэнтаў па ступенях навучання. Тады не патрэбны ніякія дадатковыя конкурсныя экзамены. Калі ёсць, скажам, 20 месцаў у магістратуры, яны прапаноўваюцца першым 20 студэнтам паводле рэйтынгу. Менавіта так робіцца на эканамічным факультэце, дзе ўжо працуе двухгадовая магістратура.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Добрая кніга будзе заўсёды запатрабавана

*Якія змены павінны адбыцца ў выдавецкай дзейнасці БДУ? Якім чынам будзе ўдасканальвацца праца Фундаментальнай бібліятэкі універсітэта? На гэтыя і іншыя пытанні адказвае госць газеты "Беларускі універсітэт" — прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ, старшыня Рэдакцыйна-выдавецкага савета БДУ, доктар эканамічных навук, прафесар Уладзімір Леанідавіч КЛЮНЯ.*



**— Рэфармаванне адукацыйнага працэсу, якое зараз праводзіцца ў БДУ, немагчыма без распрацоўкі і ўкаранення новых тэхналогій і інавацыйных формаў і метадаў навучання. Якія якасныя змены павінны адбыцца ў выдавецкай дзейнасці БДУ ў бліжэйшыя гады?**

— Важнай умовай паспяховага ажыццяўлення адукацыйнага працэсу з'яўляецца забеспячэнне студэнтаў і выкладчыкаў вучэбна-метадычнай літаратурай, якая б адпавядала сучасным патрабаванням.

Таму адным з найбольш важных кірункаў з'яўляецца распрацоўка, абгрунтаванне і аператыўнае выданне вучэбна-метадычнай, даведачнай і навуковай літаратуры для забеспячэння эфектыўнасці навучальнага працэсу і навуковай дзейнасці БДУ.

З'яўленне і размеркаванне самых сучасных інфармацыйных тэхналогій, у тым ліку Інтэрнэта, не зніжае попыт на выданне навучальных матэрыялаў, а толькі робіць яго больш дынамічным і стымулюе яго рост.

Больш таго, сённяшнія змены ў сістэме адукацыі запатрабавалі рэзка пашырыць дыяпазон, спектр як вялікіх, так і малааб'ёмных выданняў, а таксама скараціць тэрмін іх выпуску. Тыражы могуць быць малыя і звышмалыя для забеспячэння малакантынгентных спецыяльнасцей і спецыялізацый універсітэта.

Існуе патрэба ў распрацоўцы і прыняцці мэтавай ведамаснай праграмы "Выдавецкая дзейнасць БДУ (2004—2008 гады)", якая б прадугледжвала ажыццяўленне мерапрыемстваў па стварэнні новага, больш сучаснага і эфектыўнага вучэбна-метадычнага забеспячэння вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Такая праграма распрацавана ў адпаведнасці з пастановай Вучонага савета БДУ "Стан і перспектывы развіцця навучальна-выхаваўчага працэсу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце" ад 24 чэрвеня 2004 года, а таксама з нарматыўна-прававымі дакументамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Праграма вызначае асноўныя напрамкі развіцця і дзейнасці БДУ і яго падведамасных падраздзяленняў для забеспячэння навучальнага працэсу і навукова-даследчых работ універсітэта. Праграма разлічана на 2004—2008 гады.

Мэта праграмы — дасканалая арганізацыя выдавецкай дзейнасці БДУ: поўнае забеспячэнне навучальна-выхаваўчага працэсу якаснай вучэбна-метадычнай літаратурай, якая б адпавядала патрабаванням дзяржаўнага адукацыйнага стандарта, стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў, аўтарскіх курсаў лекцый, вучэбна-метадычных комплексаў, практыкумаў, зборнікаў задач, даведнікаў і г.д.

**— Па якіх асноўных напрамках будзе развівацца гэтая праграма?**

— Існуе некалькі напрамкаў. Па-першае, мы павінны ўдасканаліць планаванне, адпрацаваць структуру і змест штогадовага Тэматычнага плана выдання літаратуры і ўвесці перспектыўнае планаванне і фарміраванне заказу на малатыражную літаратуру для новых спецыяльнасцей (спецыялізацый). Па-другое, неабходна распрацаваць і зацвердзіць нарматыўную базу. Трэці напрамак — удасканаленне сістэмы камплектавання фондаў фундаментальнай навукова-тэхнічнай бібліятэкі літаратурай, якая выдаецца ў БДУ. Чацвёрты напрамак — мадэрнізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ, набыццё сучаснай камп'ютарнай тэхнікі, забеспячэнне плошчамі. Акрамя таго, у рамках праграмы плануецца стварыць на серверы БДУ электронную бібліятэку для самастойнай работы студэнтаў, працягваць развіваць паліграфічную базу БДУ (РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ") і ўвогуле палепшыць фінансавую падтрымку вучэбнага кнігавыдання.

Ход выканання праграмы будзе ацэньвацца Рэдакцыйна-выдавецкім саветам БДУ, а штогадовая справаздача — заслухоўвацца на пасяджэнні Вучонага савета БДУ ў канцы акадэмічнага года.

**— Якія, на Вашу думку, павінны быць новыя падыходы да фарміравання Тэматычнага плана?**

— Сёння стала відавочна, што штогадовая практыка фарміравання Тэматычнага плана выдання вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навуковай і даведачнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта і яго рэалізацыі патрабуе сур'ёзных арганізацыйных і метадычных рас-

(Заканчэнне на 6-й стар.)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# адукацыі

**— На што накіравана праграма ўвядзення ў адукацыйны працэс крэдытна-модульнай сістэмы?**

— Крэдытна-модульная сістэма ўводзіцца з галоўнай мэтай забеспячэння мабільнасці студэнцтва, прадастаўлення студэнтам вышэйшых навучальных устаноў магчымасці праслухаць нейкія курсы або правучыцца год ці болей у розных ВНУ. Немагчыма прымусіць усе універсітэты вучыць аднолькава, ды і не патрэбна гэта. У розных універсітэтах існуюць і розныя навуковыя школы, якія могуць даць паглыбленую падрыхтоўку ў тых ці іншых галінах ведаў.

Зразумела, што ў рамках адной ВНУ гэтую сістэму няма сэнсу ўкараняць. На першым этапе неабходна яе ўкараніць хаця б у рамках краіны, як гэта зрабіла Украіна. У нас жа пакуль нават плаціць трэба, каб перавесціся ў іншую ВНУ. Прынятая ў Еўропе Балонская дэкларацыя, напрыклад, наадварот стварае ўмовы для высокай мабільнасці студэнтаў, выкладчыкаў. Каб выкладчык таксама мог паехаць папрацаваць у іншую ВНУ, павысіць сваю кваліфікацыю. Сёння агульнапрызнана, што замкнёная ў рамках адной ВНУ адукацыйная сістэма нежыццяздольная. Перш за ўсё, гэта надзвычай дарага. Нават па тых жа навуковых прыладах: аднаму універсітэту проста немагчыма закупіць усё перадавое, што ёсць у свеце. Штосьці можа быць добра аснашчана ў адным універсітэце, у другім — нейкі іншы кірунак. Ад сумеснага карыстання выйграюць усе: і студэнты, і выкладчыкі, і навука.

Важна таксама, што пры рэалізацыі крэдытна-модульнай сістэмы студэнт насамрэч праектуе свой вучэбны план. Ён можа нават загадзя спланаваць, што гэта я вывучу тут, а вось гэты модуль я хачу засвоіць у іншым універсітэце.

Дарэчы, сам тэрмін "модуль" мае розныя значэнні. Як структурны элемент вучэбнага плана спецыяльнасці, ён аб'ядноўвае цыкл навучальных прадметаў. Ёсць яшчэ такое паняцце, як модуль самой вучэбнай дысцыпліны, у які ўваходзяць пэўныя раздзелы. Асабліва гэта важна пры рэйтынгавай сістэме, калі на працягу семестра студэнт павінен здаваць прадмет па асобных блоках.

Мы прыйшлі да высновы, што кантроль ведаў студэнтаў павінен ажыццяўляцца не толькі ў час экзамена, а і на працягу ўсяго семестра. Дарэчы, гэта агульнасусветная практыка. Напрыклад, ёсць такі вопыт, што на самім экзамене, як бы выдатна ты ні адказваў, атрымаеш максімум 25 балаў па 100-бальнай сістэме. Чаму? Таму што на экзамене ты адказваеш не па ўсёй праграме. А далей улічваецца ўсё астатняе — прысутнасць на занятках, кантрольныя, лабараторныя, практыка і г.д. Каб у выніку атрымаць дадатную адзнаку, не абавязкова самую высокую, трэба набраць не менш 60 балаў. Тая сістэма ацэнкі ведаў, што ў нас да гэтай пары існуе, састарэла.

Крэдыт звычайна налічваецца за навучальны прадмет у залежнасці ад аб'ёму гэтага прадмета. А пад аб'ёмам разумеецца, колькі часу ты павінен быў затраціць на авалоданне прадметам з улікам самастойнай працы. Праграма па павелічэнні аб'ёму самастойнай працы студэнтаў якраз і разлічана на тое, каб значна скараціць аб'ём аўдыторных заняткаў, стварыць умовы для самастойнай працы студэнтаў. Сёння, калі ў студэнта 40 гадзін аўдыторных заняткаў у тыдзень, яму проста часу не хапае на самастойную працу. Але нават калі мы скароцім аўдыторныя заняткі, усё роўна нам прыйдзецца пераглядаць вучэбныя планы, якія сёння перагружаны. Без гэтага наўрад ці ўдасца арганізаваць эфектыўную самастойную працу студэнтаў.

Дарэчы, крэдытна-модульная сістэма ўжо закладзена ў праекты новых адукацыйных стандартаў. Але яшчэ раз паўтараю: яна мае сэнс, толькі калі будзе ўводзіцца ў многіх ВНУ адначасова. У праекце Закона аб вышэйшай адукацыі яе неабходнасць закладзена. Мяркую, што і наша краіна будзе з цягам часу далучана да Аб'яднанай дэкларацыі міністраў адукацыі еўрапейскіх краін, якую называюць Балонскай дэкларацыяй. Некалькі тыдняў таму ў Варшаве па ініцыятыве Маскоўскага і Ягелонскага універсітэтаў адбылася нарада рэктараў універсітэтаў Польшчы, Беларусі, Украіны, Расіі. Вырашана, падключыўшы яшчэ і прыбалтыйскія краіны, стварыць цэнтральна-еўрапейскую сетку універсітэтаў. У яе рамках ВНУ змогуць абменьвацца студэнтамі і выкладчыкамі, створаць доступ, у тым ліку праз Інтэрнэт, да навучальных планаў і праграм, а можа, і электронных сродкаў навучання. Плануецца таксама, што будуць узгадняцца і навучальныя планы універсітэтаў. Каб удзельнічаць у праекце, кожная ВНУ павінна адпавядаць пэўным якасным патрабаванням, у тым ліку мець крэдытна-модульную сістэму.

**— Калі крэдытна-модульная сістэма будзе ўведзена па Беларусі, дык усе захочуць вучыцца ў БДУ...**

— Я думаю, для студэнтаў беларускіх ВНУ будзе выдзелены нейкі аб'ём навучальных месцаў, а не проста — хто пажадае, той і прыедзе да нас вучыцца. Прытым гэтае навучанне можа ажыццяўляцца і на платнай аснове. Гэта таксама адна з магчымасцей пашырэння платных адукацыйных паслуг: скажам, прыём на 1—2 гады на так званае ўключанае навучанне студэнтаў іншых ВНУ.

**— Мэтавая праграма "Удасканальванне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў" — адзіная, якая ўжо працуе. Якія мерапрыемствы гэтай праграмы ўжо ўдалося ажыццявіць? Як зрабіць студэнта актыўным удзельнікам адукацыйнага працэсу? Што азначаюць словы "студэнт павінен вучыцца сам"?**

— Гэтая праграма разлічана недзе на 5—6 гадоў, і яе выкананне фактычна толькі пачалося. Але многае, напрыклад у стварэнні вучэбна-метадычнай базы, ужо было зроблена раней. Цяпер мы падыйшлі да іншага, не менш адказнага этапу — нам неабходна аптымізаваць вучэбныя планы. Сёння ў іх шмат дысцыплін, якія не маюць прамых адносінаў да адпаведнай спецыяльнасці. Трэба думаць, як паменшыць іх аб'ём, увогуле аб'ём аўдыторных заняткаў, як стварыць умовы для самастойнай працы студэнтаў і ў той жа час палепшыць якасць іх падрыхтоўкі. Для нашых студэнтаў надзвычай актуальна таксама вучыцца самастойна прымяняць атрыманыя веды для вырашэння практычных задач. Як сведчаць вынікі даследавання, праведзенага Сусветным банкам, менавіта ў гэтым выпускнікі нашых ВНУ значна прайграюць выпускнікам ВНУ заходніх краін.

Развіццё самастойнай работы студэнтаў дазволіць нам палепшыць колькасныя суадносіны выкладчыкаў і студэнтаў. Наколькі я ведаю, у сярэднім па рэспубліцы на аднаго выкладчыка зараз прыходзіцца дзесьці каля 11 студэнтаў. У заходніх універсітэтах — ад 16 да 25 студэнтаў. А ў нас — 6 студэнтаў на аднаго выкладчыка. Такія суадносіны не толькі ўдаражаюць падрыхтоўку спецыялістаў, але і ствараюць праблемы з укамплектаваннем выкладчыкамі некаторых кафедр. Таму і ў нас колькасць студэнтаў на аднаго выкладчыка непазбежна будзе павялічвацца.

З апошняга, што зроблена ў рамках мэтавай праграмы, магу адзначыць тое, што на навукова-метадычным савеце пасля вялікай дыскусіі зацвердзілі ў першым чытанні канцэпцыю самастойнай работы ў БДУ, распрацаваную кафедрай педагогікі і праблем развіцця адукацыі. Зацвердзілі таксама часовае палажэнне аб бакалаўрскай выпускной рабоце. Пакуль часова дамовіліся, што яна будзе абараняцца на факультэцкай камісіі, зацверджанай дэканам, а атэставацца студэнты на прысуджэнне ступені бакалаўра будуць па выніках здачы дзяржаўных экзаменаў.

*Гутарыла Таццяна КАЗАК*
*Фотаздымак Аляксандра СНАПКА*

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# Вопыт студэнцкага самакіравання ў інтэрнатах

*Семінар "Вопыт арганізацыі студэнцкага самакіравання ў студэнцкім гарадку БДУ і ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь" адбыўся 15 снежня на базе студгарадка.*

Падчас мерапрыемства адбылося пленарнае пасяджэнне з удзелам прарэктараў па вучэбна-выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце нашага універсітэта і Акадэміі кіравання. Удзельнікі семінара прайшлі з экскурсіяй па інтэрнатах БДУ, а потым прынялі ўдзел у працы секцый "Арганізацыя выхаваўчай работы ў студэнцкім гарадку БДУ і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь", "Падтрымка маладзёжных ініцыятыў у рамках органаў студэнцкага самакіравання ў студгарадку БДУ і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь", "Студэнцкія сродкі масавай інфармацыі". Падчас семінара адбылося падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве паміж студгарадком і Цэнтрам выхаваўчай работы і маладзёжных ініцыятыў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Завяршылася мерапрыемства фестывалем студэнцкай песні "Срэбраныя струны" і шоу-праграмай у дыска-клубе "WestWorldClub".

*Наталля КАСЬЯНЕНКА*

ПОСТФАКТУМ

# Вызначаны лепшыя куратары года БДУ

Дзеля актывізацыі і ўдасканалення працы куратараў, абмену досведам і ўкаранення інавацыйных формаў выхаваўчай работы ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю правяло конкурс "Куратар года БДУ". На конкурсе разглядаліся вынікі працы куратараў за 2003/2004 навучальны год.

Для таго каб найбольш аб'ектыўна ацаніць працу куратараў, якія ўдзельнічалі ў конкурсе, у іх навучальных групах было праведзена анкетаванне. Вынікі яго засведчылі, што паміж куратарамі і студэнтамі існуе ўзаемаразуменне. Апрача думак студэнтаў, улічвалася мноства іншых фактараў: меркаванне дэканаў пра выхаваўчую работу на факультэтах, наяўнасць у канкурсантаў публікацый у сферы выхаваўчай работы са студэнтамі, разнастайнасць праведзеных мерапрыемстваў і інш. Пераможцамі конкурсу сталі дацэнт, кандыдат юрыдычных навук Валянціна Сцяпанаўна Бранавец (І месца), выкладчык біялагічнага факультэта Андрэй Эдуардавіч Каранькоў (ІІ месца), выкладчыца ДзІКСТ Вольга Сяргееўна Паўлава (ІІІ месца). Па выніках конкурсу пераможцы атрымалі грашовыя ўзнагароды.

*Вольга ЯРАШ*

ПАДЗЕІ

# Студэнты БДУ на борце "Брыганціны"

У рамках традыцыйнай выязной "Школы маладзёжнага актыву" ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю 10—12 снежня арганізавала семінар студэнцкага актыву "Студэнт — выкладчык: асаблівасці прафесійнага ўзаемадзеяння". Удзел у ім прынялі



студэнцкія актывісты — прадстаўнікі студэнцкага Савета па якасці адукацыі, Савета старастаў, Студэнцкага саюза, камітэта БРСМ, студсаветаў інтэрнатаў, прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў. Студэнты былі размешчаныя ў цёплых і ўтульных чатырохмесных пакоях.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў "Школы маладзёжнага актыву" звярнуўся прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях В.В. Савораў. Пазнаёміцца і пасябраваць удзельнікам дапамагла "Псіхалагічная гасцёўня", якую правёў кіраўнік псіхалагічнай службы БДУ Р.П. Папок. У рамках семінара прайшлі лекцыі, прысвечаныя сацыялагічным падыходам да ацэнкі якасці выкладання. Іх правёў доктар сацыялагічных навук, прафесар, дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ Д.Г. Ротман. Ён расказаў пра сацыялогію ўвогуле і пра тое, як правільна праводзіць сацапытанні. Апрача таго, у рамках цыкла адукацыйна-светапоглядных лекцый прафесараў БДУ "Я, навука, свет" Д.Г. Ротман прачытаў лекцыю "Сацыялагічная навука і сучасны свет".

На практычных занятках разглядаліся пытанні этыкі сацыёлага. Паколькі актыў — гэта самая творчая і ініцыятыўная частка моладзі, самі студэнты таксама прынялі чынны ўдзел у працы семінара. На працягу трох гадзін яны працавалі па групах: вучыліся правільна фармуляваць пытанні для анкет, прысвечаных якасці выкладання.

Акрамя лекцый, практычных заняткаў і традыцыйнай начной дыскатэкі, студэнты разам з выкладчыкамі гралі ў футбол, валейбол, настольны тэніс і більярд, хадзілі ў саўну і плавалі ў басейне, гулялі па лесе... Два дні праляцелі незаўважна.

*Юлія ПАПОВА, Вольга ЯРАШ*
*Фота Юліі ПАПОВАЙ*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Адшукаць свайго абітурыента

*На пытанні "Беларускага універсітэта" адказвае дэкан факультэта для беларускіх і замежных грамадзян, адзін з кіраўнікоў праграмы развіцця "Абітурыент БДУ" Вячаслаў Міхайлавіч МАЛАФЕЕЎ.*



**— Якія асноўныя задачы павінна вырашаць праграма "Абітурыент БДУ"?**

— Мэтай праграмы "Абітурынент БДУ" з'яўляецца правядзенне вялікага комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці, найперш, прафарыентацыйнай працы сярод кантынгенту патэнцыяльных абітурыентаў БДУ, падрыхтоўка іх да паступлення ва універсітэт і развіццё ў цэлым сістэмы давузаўскай адукацыі універсітэта.

Рэалізацыя гэтай праграмы патрабуе вырашэння наступных задач:

распрацоўка вучэбна-метадычных комплексаў для сістэмы давузаўскай адукацыі, якія ўключаюць вучэбныя праграмы па профільных прадметах, дыдактычныя матэрыялы і г.д.;

распрацоўка эфектыўнай сістэмы пошуку найбольш таленавітай моладзі, якая мае схільнасці да даследчай і аналітычнай працы, стварэнне адпаведных умоваў і дзейсных механізмаў прыцягнення іх да конкурснага адбору ў БДУ;

аказанне кансалтынгавых паслуг навучэнцам, іх бацькам, настаўнікам, навучальным установам па пытаннях конкурснага адбору ва універсітэт, спецыфіцы і перавагах навучання ў БДУ.

**— Як Вы можаце ацаніць узровень працы з абітурыентамі цяпер ва універсітэце?**

— Ва універсітэце склалася досыць разгалінаваная сістэма працы з абітурыентамі. Яна ўключае давузаўскую падрыхтоўку на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі, навучанне найбольш таленавітых дзяцей рэспублікі ў ліцэі БДУ, працу школ юных на факультэтах, развіццё профільных і спецыялізаваных класаў у шэрагу вядучых школ краіны, якія працуюць пад метадычным суправаджэннем факультэтаў, арганізацыю правядзення алімпіяды "Абітурыент БДУ" па ўсіх профільных прадметах сярэдняй школы. Здавалася б, сістэма шматгранная, дый устойлівы конкурс у БДУ на ўступных экзаменах (3—4 чалавекі на месца) сведчыць, што ў цэлым універсітэт знаходзіць свайго абітурыента, а значыць, гэтая сістэма не патрабуе ўдасканальвання. І можна супакоіцца.

Але гэта толькі на першы погляд. Разам з тым, супакоенасці, перакананасці ў тым, што ва універсітэт заўжды прыйдзе яго абітурыент, быць не можа, пагатоў што наступствы дэмаграфічнай ямы, з якой наша краіна сутыкнецца ў бліжэйшыя гады, прымушаюць па-новаму падысці да падбору будучых студэнтаў. Гэта з аднаго боку. З другога, БДУ — гэта вядучая ВНУ краіны. А калі так, мы зацікаўленыя ў тым, каб маладыя людзі з усіх, нават самых аддаленых куткоў краіны маглі адчыніць дзверы ў нашу Alma mater. Нарэшце, дыскусіі, якія вядуцца пра арганізацыю прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, сведчаць, што пакуль не склалася аптымальная сістэма адбору абітурыентаў.

Зыходзячы з гэтага, задачы, пастаўленыя ў рамках праграмы "Абітурыент БДУ", вымагаюць самых сур'ёзных адносін да гэтай праблемы як з боку рэктарата і дэканатаў факультэтаў, так і кожнага выкладчыка універсітэта.

**— Якая роля факультэта даўніверсітэцкай адукацыі для беларускіх і замежных грамадзян у рэалізацыі гэтай праграмы?**

— Нягледзячы на адсутнасць ільготаў пры паступленні для выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення, іх колькасць не зменшылася. Асноўны кантынгент слухачоў ПА на працягу трох апошніх гадоў складаюць юнакі і дзяўчаты з раённых цэнтраў, гарадскіх пасёлкаў і вясковай мясцовасці — гэта амаль 70 %, прычым больш за 20 % з іх адносяцца да ільготнай катэгорыі (Чарнобыльская зона, дзеці-сіроты, дзеці-інваліды). Такім чынам, факультэт вырашае вельмі важную задачу сацыяльнай падтрымкі выпускнікоў перыферыйных школ. Не сакрэт, што аб'ектыўна існуе сур'ёзны разрыў ва ўзроўні падрыхтоўкі выпускніка вясковай школы і выпускніка са школы абласнога цэнтра альбо сталіцы.

Навучальны працэс на падрыхтоўчым аддзяленні пабудаваны такім чынам, што дазваляе слухачам адаптавацца да універсітэцкай сістэмы адукацыі. Пра гэта сведчыць высокі ўзровень паспяховасці выпускнікоў ПА па выніках зімовай сесіі, які перавышае 90 %, што вышэй за сярэднюю паспяховасць студэнтаў І курса.

Устойлівы рост кантынгенту слухачоў падрыхтоўчых курсаў на працягу апошніх трох гадоў (так, у мінулым годзе гэтай формай было ахоплена 2200 школьнікаў) сведчыць пра неаслабную цікавасць школьнікаў да гэтай сістэмы падрыхтоўкі ў ВНУ. Апошнім часам факультэт пашырае дыяпазон формаў падрыхтоўчых курсаў. Гэта і падрыхтоўка ў малакамплектных групах, дзе практычна індывідуалізаваны працэс навучання, і вочна-завочная форма, і рэпетыцыйнае тэсціраванне.

Арганізаванае ў гэтым навучальным годзе на факультэце рэпетыцыйнае тэсціраванне ў рамках падрыхтоўкі да цэнтралізаваных экзаменаў прыцягнула толькі за паўтара месяца больш за 800 чалавек. Усё гэта кажа пра неабходнасць забеспячэння высокай якасці працы, павышэння адказнасці факультэта за гэты вельмі важны для універсітэта ўчастак работы.

*Наталля КАСЬЯНЕНКА*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Добрая кніга будзе заўсёды запатрабавана

*(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар.)*

працовак.

Тэматычны план з года ў год прымаўся неапраўдана груваcткім. У разліку на цяперашнія нарматывы і штаты выдавецкіх работнікаў упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы спатрэбіліся б яшчэ 2—3 такія ж калектывы для выканання плана. Для выдання такой колькасці кніг і брашур патрабавалася немалое фінансаванне.

І галоўнае, у Тэматычны план уключаліся рукапісы, якія яшчэ не існавалі. Зразумела, што ніякага сур'ёзнага аналізу пры гэтым не праводзілася. У выніку ва ўпраўленні рэдакцыйна-выдавецкай работы налічваецца 147 рукапісаў — некаторыя з іх па пэўных прычынах былі ў плане яшчэ з 2002 года. У лістападзе гэтага года прадстаўлена звыш 80 рукапісаў. Пры беглым праглядзе выяўлена, што многія рукапісы рыхтаваліся без уліку наяўных патрабаванняў.

Мы прыйшлі да высновы, што для паляпшэння якасці рукапісаў і для прадуманага фарміравання штогадовага Тэматычнага плана неабходна ўвесці практыку перспектыўнага планавання. Гэта значыць, што работа з рукапісамі можа быць падзелена на дзве часткі: падрыхтоўчую (перспектыўны план) і выканаўчую (Тэматычны план).

**— Адна з найважнейшых умоваў эфектыўнасці навучальнага, навукова-даследчага і кіраўніцкага працэсаў ва універсітэце з'яўляецца іх паўнавартаснае інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне. Без удзелу Фундаментальнай бібліятэкі БДУ рэалізаваць гэта ўсё немагчыма. Па якіх напрамках павінна ўдасканальвацца ў сувязі з гэтым дзейнасць універсітэцкай бібліятэкі?**

— На працягу апошніх дзесяцігоддзяў адбылася змена парадыгмы дзейнасці бібліятэк. Асноўнымі прыярытэтамі для іх стала не столькі атрыманне, апрацоўка і захаванне інфармацыі, колькі яе распаўсюджванне і забеспячэнне доступу да яе крыніц. Па часе гэта супала з бесперапынным ростам коштаў на інфармацыйныя рэсурсы, якія бібліятэка павінна набываць, каб забяспечыць эфектыўнасць адукацыйнага працэсу і навуковых даследаванняў. Праз рост коштаў на перыядычныя выданні і манаграфіі скарацілася іх набыццё, хаця сёння бібліятэкі выдаткоўваюць больш сродкаў, чым у мінулыя гады. У Беларусі апошнім часам кошт падпіскі на перыядычныя выданні расце ад паўгоддзя да паўгоддзя ў сярэднім на 15—20 %.

Цяпер бібліятэкі павінны прайсці праз чарговую трансфармацыю, шырока выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сродкі камунікацыі. Перспектыўнымі бачацца такія напрамкі развіцця, як стварэнне электронных падручнікаў і распаўсюджванне іх сярод студэнтаў, развіццё супрацоўніцтва паміж бібляітэкай і выдавецтвам БДУ для выдання вострадэфіцытнай навучальнай літаратуры, забеспячэнне доступу да паўнатэкставых баз даных навуковых і навучальных матэрыялаў у лакальнай сетцы універсітэта, даступнасць капіравальнага і сканавальнага абсталявання для студэнтаў і выкладчыкаў і г.д. Усё гэта дазволіць адмовіцца ад закупкі вялікай колькасці навучальнай літаратуры і пашырыць спектр навуковых выданняў, якія купляе бібліятэка.

Важна таксама ўкараніць сучасную аўтаматызаваную інфармацыйна-бібліятэчную сістэму (АІБС), якая дазволіць скараціць руцінную работу спецыялістаў бібліятэкі і павысіць узровень абслугоўвання чытачоў.

Адна з праблем у тым, што цяпер універсітэцкая бібліятэка не можа забяспечыць запыты чытачоў, што пастаянна ўзрастаюць і ўскладняюцца, толькі праз свае фонды і інфармацыйныя рэсурсы, асабліва калі гаворка ідзе пра замежныя публікацыі. Гэтая тэндэнцыя назіраецца сёння практычна ва ўсіх бібліятэках — не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце. Таму важнай задачай для бібліятэкі становіцца арганізацыя доступу да сусветных інфармацыйных рэсурсаў.

Важнае значэнне мае таксама стварэнне і фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў самога БДУ і яго бібліятэкі. Найбольш перспектыўным напрамкам у плане арганізацыі ўласных электронных інфармацыйных рэсурсаў з'яўляецца стварэнне паўнатэкставых баз даных навуковых работ супрацоўнікаў БДУ. Такая база дазволіла б нашаму універсітэту на роўных удзельнічаць у разнастайных міжнародных ініцыятывах, накіраваных на зніжэнне выдаткаў на камплектаванне ўласных фондаў на падставе бясплатнага доступу да он-лайнавых электронных інфармацыйных рэсурсаў. Да такіх ініцыятываў адносяцца праекты SPARC, Open Archives Initiative і інш.

У рамках удзелу ў міжнародных праектах Elib і VirLib універсітэцкая бібліятэка атрымала і адаптавала праграмна-тэхнічныя рашэнні па стварэнні і ўкараненні электроннай бібліятэкі навуковых работ супрацоўнікаў БДУ. Сёння неабходна ў рамках супрацоўніцтва факультэтаў, кафедраў, навуковых цэнтраў, Выдавецкага цэнтра, бібліятэкі БДУ і інш. распрацаваць працэдуры і механізм стварэння, укаранення і папаўнення такой электроннай бібліятэкі БДУ. Роля бібліятэкі пры гэтым будзе, канечне, заключацца ў стварэнні пошукава-даведачнага апарата такой бібліятэкі і прадастаўлення на яе базе інфармацыйных паслуг. Пералік дакументаў пры гэтым можа быць вельмі шырокім: курсы лекцый, падручнікі, матэрыялы канферэнцый, аўтарэфераты дысертацый і г.д.

Яшчэ адзін перспектыўны напрамак развіцця — электронная дастаўка дакумента (ЭДД). Пад гэтым тэрмінам мы разумеем механізм забеспячэння кліентаў копіямі першакрыніц з аддаленых рэсурсаў (Расія, СНД, іншыя краіны) у электроннай копіі па тэлекамунікацыйных каналах. Гэты праект рэалізуецца ў супрацоўніцтве з Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій. У бібліятэцы БДУ плануецца стварыць таксама фонд электронных рэсурсаў нашага універсітэта, каб, у сваю чаргу, прапанаваць іх карыстальнікам бібліятэкі і аддаленым карыстальнікам.

Сёння перад бібліятэкай стаіць задача пашырыць пералік крыніц інфармацыі, прыцягваючы як крыніцы інфармацыі на нетрадыцыйных носьбітах, якія ёсць у бібліятэцы, так і тыя крыніцы, што існуюць па-за яе межамі. Карыстальніка цікавіць найперш вынік інфармацыйнага пошуку, а не тое, дзе размяшчаецца крыніца інфармацыі. Ва ўмовах сучаснага інфармацыйнага буму адной бібліятэцы (якой бы вялікай яна ні была) немагчыма апрацаваць увесь масіў інфармацыі па нейкім пытанні, тым болей што інфармацыя пастаянна папаўняецца і абнаўляецца. Вырашэнне праблемы мне бачыцца ў развітай каапераціі бібліятэк як унутры аднаго ведамства, так і на міжведамасным узроўні. Таму і бібліятэка БДУ бачыць сваю місію ў каардынацыі намаганняў сеткі вузаўскіх бібліятэк па арганізацыі адзінай інфармацыйнай прасторы, найперш — у сферы адукацыі.

Яшчэ адзін кірунак развіцця універсітэцкай бібліятэкі — канцэпцыя адкрытых для чытачоў фондаў. Сёння яна стала дамінуючай і ўкаранена паўсюль, дзе ёсць умовы для гэтага: дастатковая прастора ў чытальнях і абсталяванне, якое перашкаджае несанкцыяванаму вынасу літаратуры. У чытальнях наведвальнікі змогуць самі прагледзець усе выданні, пастаўленыя на паліцах па тэмах у алфавітным парадку, папрацаваць з кнігамі і часопісамі на месцы альбо зрабіць ксеракопіі. Мяркую, гэтая форма будзе ўкаранена ва ўсіх філіялах бібліятэкі, якія ўводзяцца ў дзеянне, — на юрыдычным, хімічным факультэтах, факультэце журналістыкі і інш.

Неабходна таксама мадэрнізаваць фізічную прастору бібліятэкі, давёўшы колькасць пасадачных месцаў да неабходнага мінімуму і забяспечыўшы іх у дастатковай колькасці камп'ютарнай тэхнікай.

*Вольга АНІНА*
*Фотаздымак Аляксандра СНАПКА*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Здабываць веды праз камп'ютар



*Пра ўкараненне ў адукацыйны працэс інфармацыйных тэхналогій расказвае прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, загадчык кафедры вылічальнай матэматыкі, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Павел Аляксеевіч МАНДРЫК.*

**— Адной з найважнейшых задач па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу з'яўляецца арганізацыя самастойнай творчай кантралюемай работы студэнтаў на аснове інфармацыйных тэхналогій. Якім чынам, на Вашу думку, гэтая задача павінна вырашацца ў нашым універсітэце?**

— Стратэгія вырашэння гэтай задачы вызначана загадам рэктара №327 ад 30 верасня, дзе і акрэслены асноўныя этапы па яе рэалізацыі. У БДУ вылучаны два факультэты: адзін гуманітарнага профілю, адзін — прыродазнаўчага, — якія першымі ўступяць у этап абнаўлення навучальнага працэсу на базе інфармацыйных тэхналогій. Гэта гістарычны факультэт і геаграфічны факультэт. Акрамя таго, два факультэты — прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і факультэт радыёфізікі і электронікі — вызначаны ў якасці базавых факультэтаў, якія будуць дапамагаць гэтым факультэтам усё арганізоўваць. Мяркуецца, што ўжо ў гэтым навучальным годзе для першакурснікаў вызначаных факультэтаў будзе створана інфармацыйнае забеспячэнне, а з верасня 2005 г. першы курс гэтых факультэтаў непасрэдна ўжо акунецца ў выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у сваёй працы. Далейназапашаны вопыт пераносіцца на першыя курсы астатніх факультэтаў. І так паступова мы ўжо будзем напаўняць інфармацыйным зместам наш адукацыйны працэс.

Трэба сказаць, што ва ўсёй гэтай працы неабходна вылучаць абавязковы аспект, тое, што распрацоўваецца нашым факультэтам і факультэтам радыёфізікі і электронікі, — гэта забеспячэнне абавязковых аўдыторных заняткаў па кантралюемай самастойнай работы электроннымі сродкамі, дзе студэнт мае магчымасць пазнаёміцца з праграмай курса, мае магчымасць пагледзець, дзе знаходзяцца ў гэтай праграме тыя веды, якія ён павінен самастойна вывучыць. Далей для яго распісаны парадак самастойнай работы, якім чынам ён гэта вывучае, даюцца спасылкі на электронныя хрэстаматыі, дзе непасрэдна ў электронным выглядзе ён можа ўсё гэта прачытаць і вывучыць, а таксама ёсць спасылкі на бібліятэчныя рэсурсы. Яшчэ адным з важных звёнаў з'яўляецца магчымасць у электронным асяродку прайсці этап саматэсціравання. І завяршаецца гэта ўсё абавязковым тэсціраваннем на камп'ютары. Прычым гэта будзе тэсціраванне на ўзроўні допуску да здачы заліка ці экзамена. Студэнты будуць праходзіць гэтае тэсціраванне ў агульнауніверсітэцкім класе. Калі пасля гэтага яны атрымаюць допуск камп'ютара — маюць ужо магчымасць праходзіць далей.

Такім чынам, камп'ютарнае тэсціраванне становіцца абавязковым, паступова інфармацыйныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца на ўсіх спецыяльнасцях усіх факультэтаў на ўсіх курсах, і студэнты ўжо прызвычайваюцца да камп'ютара як да інструмента, які дазваляе шукаць і здабываць веды.

**— Раскажыце, калі ласка, пра вопыт выкарыстання інфармацыйных тэхналогій на вашым факультэце. Якія яшчэ факультэты універсітэта паспяхова працуюць у гэтым кірунку?**

— Для факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій сапраўды з'яўляецца натуральным. І само навучанне на факультэце гэта прадугледжвае. Ужо шмат гадоў мы выкарыстоўваем тэставыя праграмы: напрыклад, каб атрымаць доступ да экзамена па праграмаванні, неабходна спачатку прайсці тэсты на камп'ютары. І сам навучальны працэс пабудаваны з шырокім выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій — сервераў, агульных баз даных, нейкіх электронных дапаможнікаў, падручнікаў, тэставых, рэйтынгавых праграм і г.д. Іншая справа, што гэта не носіць сістэмнага характару. Ды і ўсе прыродазнаўчыя факультэты універсітэта, я думаю, актыўна выкарыстоўваюць інфармацыйныя тэхналогіі. Але тое, што робіца цяпер ва універсітэце, — гэта сістэмны шырокамаштабны масавы падыход да ўкаранення інфармацыйных тэхналогій у забеспячэнне навучальнага працэсу на ўсіх спецыяльнасцях. Агульнауніверсітэцкая сістэма, якую мы цяпер распрацоўваем, уключае, як я ўжо казаў, абавязковы аспект — гэта кантралюемая самастойная работа, дзе мы падрабязна распісваем працэдуру, парадак, напаўненне і інш., а ўжо далей ёсць магчымасць гэта пашыраць. Напрыклад, якая-небудзь кафедра мае нейкі свой тэставы модуль, сваю праграму, якую можна ўключыць у гэтую агульную сістэму і выкарыстоўваць па поўнай дысцыпліне. Калі хтонебудзь, напрыклад, распрацаваў электронны падручнік (не проста тэкставае напаўненне, а сапраўдны электронны падручнік!) — калі ласка, ёсць магчымасць гэта ўключыць у сістэму, і студэнт зможа ім скарыстацца. Гэта ўжо самастойнае развіццё кафедраў, факультэтаў, творчасць выкладчыкаў.

**— На Вашу думку, ці склаліся ўмовы для паспяховай рэалізацыі праграмы інфарматызацыі навучальнага працэсу ў БДУ? Ці гатовыя да гэтага студэнты і прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта?**

— Псіхалагічна гатовыя ўсе. Я думаю, не знойдзецца такога чалавека, які б сказаў, што гэта не трэба. Іншая рэч, што выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у навучальным працэсе павінна быць разумным. Каб не нашкодзіць адукацыйнаму працэсу, каб інфармацыйныя тэхналогіі сапраўды не пачалі даваць адваротны эфект. Калі мы ўсё "перажаванае" выставілі ў электроннай форме і студэнту застаецца толькі гэта прачытаць і завучыць, тады ніякага пошуку, творчага мыслення не будзе. Гэтага не павінна быць, і тыя падыходы, якія мы распрацоўваем, гэта ўлічваюць.

Дарэчы, ва універсітэце ўжо створаны Каардынацыйны савет па пытаннях інфарматызацыі, створаны працоўныя групы, ёсць план мерапрыемстваў на гэты навучальны год, вызначаны загадам рэктара № 344. Канешне, ёсць праблема з забеспячэннем камп'ютарнай тэхнікай, дадатковымі плошчамі, на якіх гэта размяшчаць, гэта і чалавечыя рэсурсы, якія павінны забяспечваць функцыянаванне гэтых класаў — рамонт, эксплуатацыя, настройка, напаўненне і г.д. Таму ўзяты кірунак на стварэнне цэнтралізаваных агульнауніверсітэцкіх медыякласаў, камп'ютарных класаў, якія будуць займацца цэнтралізаваным тэсціраваннем, а таксама камп'ютарных класаў для самастойнай работы студэнтаў. Зразумела, што будуць ствараюцца нейкія класы і на факультэтах, але поўнасцю забяспечыць гэты працэс вылічальнай тэхнікай можна толькі праз стварэнне вось такіх агульнауніверсітэцкіх класаў і іх абслугоўванне.

Акрамя таго, плануецца праводзіць семінары і павышэнне кваліфікацыі для выкладчыкаў па выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій і працы ў тым электронным асяродку, які ствараецца ў БДУ. У гэтым будуць дапамагаць і нашы універсітэцкія структуры, напрыклад, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ.

**— Якім чынам распрацоўваецца гэтая электронная сістэма для БДУ?**

— Сапраўды, перад Каардынацыйным саветам па пытаннях інфарматызацыі стаяла праблема: што ўзяць у якасці платформы, асновы, на якой усё гэта распрацоўваць? Разглядаліся розныя варыянты, усе яны маюць свае перавагі і недахопы. І ўрэшце спыніліся на такой распрацоўцы, як E-University, электронны універсітэт. Гэтая праграма ўжо каля двух гадоў распрацоўвалася на нашым факультэце сумесна і пад патранажам самай буйной праграмісцкай арганізацыі ў Беларусі — СП "Міжнародны дзелавы альянс". Мы распрацавалі тэхнічнае заданне, дзе гэтая сістэма адаптуецца для нашага універсітэта. Сама сістэма распрацоўваецца, дарэчы, адначасова з тым матэрыялам, які яна будзе напаўняцца. Ужо на пачатку наступнага года гэтая сістэма будзе ўстаноўлена для выкарыстання і напаўнення на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, факультэце радыёфізікі і электронікі, гістарычным і геаграфічным факультэтах.

*Гутарыла Таццяна КАЗАК*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Госці з Турцыі

У рамках візіту ў Беларусь дэлегацыя Цэнтра стратэгічных даследаванняў Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Турцыя 8 снежня наведала наш універсітэт. Адбылася сустрэча дэлегацыі з кіраўніцтвам БДУ і падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Цэнтрам і нашым універсітэтам, якое павінна спрыяць развіццю двухбаковых кантактаў у навукова-даследчай сферы. Супрацоўніцтва будзе ажыццяўляцца праз сумесныя даследчыя праграмы, публікацыі, абмен спецыялістамі.

9 снежня пасол Турцыі, дырэктар Цэнтра Мюрат Більхан прачытаў на факультэце міжнародных адносін лекцыю пра сучасную замежную палітыку Турцыі.

*Наталля КАСЬЯНЕНКА*

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# Правы і свабоды грамадзян

Круглы стол "Канстытуцыйныя гарантыі правоў і свабодаў грамадзян" адбыўся 30 лістапада на юрыдычным факультэце БДУ.

Асаблівая ўвага надавалася гарантыям абароны і аднаўлення парушаных правоў: права на самаабарону, на судовую абарону, права на кваліфікаваную юрыдычную дапамогу, прэзумпцыю невінаватасці, забароны на выкарыстанне доказаў, атрыманых з парушэннем закону, права не сведчыць супраць самога сябе і блізкіх асобаў, права на кампенсаванне шкоды, забароны зваротнай сілы закону, якія павінны ўзмацненне адказнасці грамадзян.

У працы круглага стала прынялі ўдзел старшыня Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук прафесар Р.А. Васілевіч, намеснік дэкана юрфака БДУ, кандыдат юрыдычных навук Р.А. Шумак, дацэнты Л.А. Прыходзька, Н.М. Кандратовіч, С.А. Калінін і іншыя выкладчыкі кафедры канстытуцыйнага права, кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, крымінальнага працэсу і крымінальнага права, а таксама намеснік дэкана юрфака Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта Т.З. Шалаева.

*Людміла МУРАШКА,*
*памочнік Старшыні*
*Канстытуцыйнага суда*
*Рэспублікі Беларусь*

АБ'ЯВЫ

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:*

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: матэматычнага мадэліравання і аналізу даных;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ**: тэарэтычнай фізікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ**: атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, фізічнай электронікі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, тэхналогіі праграміравання, ураўненняў матэматычнай фізікі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, батанікі, мікрабіялогіі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, фармацыі, арганічнай хіміі, геаграфічнай экалогіі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, замежнай літаратуры, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, рускай літаратуры, славянскіх літаратур, сучаснай беларускай мовы, беларускай літаратуры і культуры, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, грамадзянскага працэсу і працоўнага права;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: тэхналогіі праграміравання, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, вышэйшай алгебры, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, сучаснай беларускай мовы, прыкладной лінгвістыкі, раманскага мовазнаўства, рускай літаратуры;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: глебазнаўства і геалогіі, раманскага мовазнаўства, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, нямецкага мовазнаўства, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ**: метадаў аптымальнага кіравання, батанікі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, Упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

## ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:*

прафесара кафедры рэабіліталогіі (1).

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15,**

**Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

АБ'ЯВЫ

## Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў студзені-лютым 2005 г. выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:**

**1.** Нацыянальная ідэя і патрыятызм у навучанні беларускай мове і літаратуры (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — вочная **(03.01—15.01);**

**2.** Праектаванне і распрацоўка тэставых асяроддзяў і модульна-рэйтынгавых сістэм (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная **(10.01—19.01, 10.03—12.03);**

**3.** Вялікая Айчыйнная вайна ў кантэксце ваенна-палітычнай гісторыі Беларусі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — вочная **(17.01—29.01);**

**4.** Эканамічная навука ў перыяд трансфармацый. Ідэалогія беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочна-завочная **(17.01—22.01, 28.02—05.03);**

**5.** Нацыянальная ідэя і патрыятызм у навучанні беларускай мове і літаратуры (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — вочна-завочная **(19.01—16.03,** 1 заняткі 1 раз у тыдзень);

**6.** Школа маладога спецыяліста — адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні прыродазнаўча-матэматычных дысцыплін (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная **(24.01—29.01, 28.02—05.03);**

**7.** Праектаванне і распрацоўка вучэбна-метадычных комплексаў у сістэме вышэйшай адукацыі (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная **(24.01—29.01, 14.03—19.03);**

**8.** Куратарства як сучасны інстытут выхавання і кіравання (для куратараў вучэбных груп ВНУ) — вочна-завочная **(31.01—04.02, 25.04—29.04);**

**9.** Кіраванне самастойнай работай студэнтаў з выкарыстаннем элементаў паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, навуковых супрацоўнікаў ВНУ) — вочна-завочная **(07.02—11.02, 02.05—06.05);**

**10.** Прыродазнаўства: праблемы выкладання (для выкладчыкаў прыродазнаўчых дысцыплін ВНУ,ССНУ) — вочна-завочная **(07.02—12.02);**

**11.** Псіхалагічнае здароўе выкладчыка і прафесійная надзейнасць (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, СШ) — вочная **(07.02—19.02);**

**12.** Кіраванне адукацыйнымі ўстановамі ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь (для дэканаў, намеснікаў дэканаў факультэтаў) — вочная **(14.02—25.02);**

**13.** Вытокі беларускай дзяржаўнасці і нацыянальная ідэя (для выкладчыкаў беларусазнаўчых дысцыплін і ідэалагічных работнікаў устаноў адукацыі) — вочная **(14.02—26.02);**

**14.** Выкарыстанне пакета "Microsoft Office 2000" у навучальным працэсе і навуковых даследаваннях (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) — вочна-завочная **(14.02—22.04,** 2 разы ў тызень);

**15.** Праектаванне і распрацоўка мадэляў кіруемай самастойнай работы студэнтаў (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная **(1 сесія: 21.02—26.02);**

**16.** Мастацтва псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная **(21.02—05.03);**

**17.** Канцэпцыя сучаснага прыродазнаўства: міждысцыплінарны сінтэз (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная **(21.02—26.02, 02.05—07.05).**

**Перападрыхтоўка**

**18.** інфармацыйна-ідэалагічная і выхаваўчая работа. Ідэолаг (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная **(17.01—12.03);**

**19.** Менеджмент у сферы адукацыі. Менеджмент (для спецыялістаў ВНУ) — вочная **(24.01—26.02);**

**20.** Эканамічная палітыка. Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін (для спецыялістаў ВНУ) — вочная **(10.01—05.03).**

*Калі вас зацікавіла наша інфармацыя і вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.*

**Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб.319, тэл/факс 200-25-51**

## Чытайце нас у Інтэрнэце

Газета «Беларускі універсітэт» мае свой сайт **(www.gazeta.bsu.by).** Вы можаце даведвацца пра новыя матэрыялы яшчэ да таго, як выйдзе свежы нумар выдання. Акрамя таго, на сайце вы знойдзеце больш поўныя версіі матэрыялаў газеты.

# З надыходзячым Новым годам і Калядамі!

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Зоркі гавораць

Згодна з кітайскім календаром, гаспадаром 2005 года будзе зялёны драўляны Певень. Таму 2005 год, на думку астролагаў, будзе суровым, абяцае многа работы, рост рызыкі і беспрацоўя. А паколькі Певень любіць парадак, магчымы пачатак новых рэформ, накіраваных на яго навядзенне. Наступаючы год спрыяе ваеннай кар'еры. Ёсць імавернасць, што год пачнецца з непрыемных здарэнняў, але гэта больш датычыцца вядомых людзей ці тых, хто імкнецца да гэтага, выкарыстоўваючы нягодныя спосабы набыць папулярнасць. У год Пеўня ім гэта прынясе дурную славу: гаспадар года не церпіць несправядлівасці і парушэння любых законаў, уключаючы маральна-этычныя нормы.

У год Пеўня патрэбна больш увагі надаваць сваім блізкім, бо ад сваёй легкадумнасці можна лёгка страціць сям'ю. Жаданне скінуць непатрэбны баласт і такім чынам умацаваць свой матэрыяльны стан можа прывесці да разводу. Утрымаць людзей ад памылак і захаваць сем'і ад распаду змогуць дзеці і любоў да іх з боку бацькоў.

Напрыканцы 2005 году могуць вырашыцца праблемы, якія хвалявалі вас на працягу апошніх паўтара гадоў. Гэта будзе стымулам паспрабаваць свае сілы ў новых кірунках, творча падысці да сваёй прафесіі, змяніць сферу дзейнасці.

## *Астралагічны Певень*

Зоркі кажуць, што гаспадар 2005 года — істота даволі цікавая і неадназначная. Певень ніколі не абмяжоўвае сябе ў словах, таму час ад часу праяўляе сябе рэзка і агрэсіўна. Гэта вяло б да шматлікіх сутыкненняў, каб яго ахвяры не ўсведамлялі, што такія адносіны — вынік адкрытасці і эксцэнтрычнасці Пеўня. Аднак яго шчырасць можа быць падманлівай. Певень сапраўды кажа ўсё, што думае, без імкнення згладзіць вострыя вуглы, але мае тэндэнцыю да эгаізму. Ён абсалютна абыякавы да пачуццяў іншых людзей і лічыць, што няма ніякіх прычын іх шанаваць. Гэта закрывае шлях Пеўню да дыпламатычнай кар'еры. Эксцэнтрычнасць Пеўня — таксама міф: ён любіць, каб яго заўважалі (гэта выяўляецца, напрыклад, праз адзенне), аднак на самой справе ён глыбокі кансерватар у адносінах як да палітыкі, так і да жыцця ўвогуле, нават калі гэта прыносіць страты яму самому.

Певень лічыць, што ён заўжды мае рацыю і добра ведае, што робіць. Ён нікому не давярае і спадзяецца на самога сябе. Адначасова Певень шчодра раздае парады ўсім і кожнаму, любіць вучыць іншых жыццю. Ён можа паказацца дзёрзкай асобай, якая заўжды шукае прыгодаў на сваю галаву, аднак гэта яшчэ адзін падман. Пеўня распірае ад шматлікіх нерэальных праектаў, але гэта звычайныя летуценні. Яму падабаецца марыць, маляваць у думках свой гераічны аўтапартрэт, але гэта магчыма толькі пры наяўнасці даволі ўтульных і камфортных умоў. Певень — філосаф у дамашніх пантофлях, недалёкі ў сваіх поглядах, мала схільны да імправізацыі.

Певень не з'яўляецца сціплай істотай: наадварот, ён даволі адважны, што тлумачыць многія з яго ўчынкаў, храбры (калі гэтага патрабуюць абставіны), можа рызыкаваць сваім жыццём з усмешкай на вуснах. Дзякуючы гэтаму з Пеўня можа ат-



рымацца добры воін. Людзі знаходзяць яго даволі цікавым чалавекам, аднак, калі Певень не будзе ставіцца да гэтага вельмі асцярожна, то рызыкуе іх расчараваць. Выхваляка і фанфарон, ён заўжды кажа нашмат больш, чым можа здзейсніць насамрэч. Ён, са сваім пастаянным зіхаценнем, больш прыемны ў грамадстве, чым у асабістых адносінах.

Маючы натуру, якая спрыяе сузіральнасці, ён можа праяўляць схільнасць да ляноты. Разам з гэтым, Певень з'яўляецца вялікім працаўнікам. Ён заўжды жадае зрабіць больш, чым можа, часта бярэцца за рэалізацыю праектаў, якія перавышаюць яго сілы. Таму іх і не ўдаецца ажыццявіць. Грошы не дастаюцца Пеўню без працы, таму ён павінен шмат працаваць, каб забяспечыць сабе добрае жыццё. Калі поле дзейнасці прыдатнае, ён можа стаць багатым. Адначасова ў яго ёсць здольнасць знаходзіць грошы нават у неспрыяльных абставінах. В'етнамцы сцвярджаюць, што з-за звычкі шкрэбсці лапамі і дзюбай Певень зможа знайсці чарвячка нават у пустэльні. Гэты сімвал характарызуе пастаяннае дзеянне. Але калі Певень дазволіць сабе аддацца летуценням і ляноце, то ён рызыкуе стаць адным з тых цікавых бадзяг-філосафаў, якія корпаюцца на сметніках, бо гэта адзін з спосабаў прыцягнуць да сябе ўвагу.

Певень здатны да сельскай гаспадаркі і прафесій, дзе даводзіцца сутыкацца з іншымі людзьмі. Яму падабаецца выстаўляцца перад іншымі, ён вялікі марнатравец і даволі часта траціць усё, што зарабляе. Певень мае тэндэнцыю да празмернай фінансавай рызыкі, што можа прывесці да катастрофы. Банкруцтва можа стаць "узнагародай" і за летуценнасць, але нават гэта не ў стане зрабіць яго эканомным.

У каханні Пеўню даводзіцца цяжкімі намаганнямі заваёўваць і ўтрымліваць прыхільнасць каханага чалавека. Часта Певень яго расчароўвае, бо не заўжды здольны ўтрымліваць рэальнасць на ўзроўні мары, якой апантаны. Але заўжды можна разлічваць на яго шчырасць.

Мужчына-Певень любіць кампанію жанчын, сярод якіх ён можа зіхацець, як дыямент, гарцаваць, заляцацца, аднак большага за гэта чакаць ад яго не варта. Разам з тым ён рэдка падтрымлівае кампанію старых сяброў, бо звычайна мужчыны хутка яму надакучваюць. Жанчына-Певень любіць быць побач з іншамі жанчынамі, яна схільная да спецыяльнасцяў, якія прывядуць да ўсталявання з іншымі трывалых зносін.

Певень можа знайсці сваё сямейнае шчасце з Быком — сем'янінам і кансерватарам. Ён можа філасофстваваць побач са Змяёй, бо ў справах і каханні Змяя прыносіць неабходную Пеўню мудрасць. Але яна павінна асцерагацца быць празмерна яркай, бо Певень можа яе проста знішчыць. З Драконам Певень (найперш жанчына-Певень) будзе поўнасцю задаволены, асабліва калі будзе дзейнічаць праз пасрэдніка. А вось Кот дрэнна трывае фанфаронства Пеўня і яго яркае пер'е, нават пагарджае нашым героем, таму яго трэба асцерагацца.

На працягу ўсіх фаз жыцця ў Пеўня будуць пад'ёмы і зрывы — як у фінансах, так і ў пачуццях. Ён можа прайсці шлях ад беднасці да багацця, ад ідэальнага кахання да самых заганных праяў гэтага пачуцця. Яго старасць будзе шчаслівай. Але народная мудрасць кажа, што два Пеўні здольныя зрабіць жыццё ў адным доме немагчымым.

Задыякальныя сузор'і таксама накладваюць свой адбітак на характар Пеўня.

**Казярог.** Рэдкая птушка, адрозніваецца глыбокімі якасцямі.

**Вадалей.** Дзіўны тып, займаецца тым, што яго датычыцца.

**Рыба.** Певень на званіцы. Глядзіць высока і напоўнены нерэальнымі праектамі.

**Авен.** Певень-змагар. Шукае сваркі з усімі, а яго агрэсіўнасць не мае абмежаванняў.

**Цялец.** Адносна спакойны Певень.

**Блізняты.** Певень-буян. Вечны ажыятаж, ніколі не спыняецца.

**Рак.** Шыры Певень, аднак часта можа быць абведзены вакол пальца.

**Леў.** Адважны певень. У стане ахвяраваць сваё жыццё не важна за каго, не важна за што.

**Панна.** Певень з люстэркам.

**Шалі.** Вясковы Певень. Спакойны і міралюбны, найбольш дыпламатычны з усіх.

**Скарпіён**. Вытанчаны Певень, найбольш цікавы з усіх.

**Стралец.** Галісійскі певень. Самы верны.

Сярод вядомых людзей, што нарадзіліся у год Пеўня, можна ўзгадаць Аляксандра I, А. Суворава, К. Заслонава, І. Гёбельса, Б. Мантгомеры, Ф. Купера, Ф. Бэкана, М. Прышвіна, Сакрата, А. Рышэльё, І. Паўлава, А. Калчака, А. Грамыку і іншых пісьменнікаў, філосафаў, навукоўцаў і палітыкаў, якія ўвайшлі ў гісторыю. Наогул, сярод Пеўняў шмат глыбокіх мысліцеляў і адораных асоб, якія любяць працаваць і адданыя сваёй справе.

*Падрыхтаваў Вадзім ЗУБРЫЦКІ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*16 снежня 2004 года*

*Падпісана да друку 15.12.2004 г.*
*Ум. друк. арк. 2*
*Зак. 1166. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

**Рэдактар Таццяна КАЗАК**

*Адрас рэдакцыі:*
*220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by*
*www.gazeta.bsu.by*